© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016



Газета заснавана ў 1938 годзе.
Аднаўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№ 8 (89). 18 — 24 лютага 1999 г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік. Распаўсюджваецца ў Слоніме, Зэльве, Дзятлаве, Мастах. Кошт 15 тыс. руб.

СЛОНІМ

нашы людзі









Фотарэпартаж Мікалая СУПРУНА *(Працяг на 2 стр.)*

ЦЫТАТА НУМАРА

Прыцягнем

"Станіслаў Тадэвушавіч зазначыў, што на адказны перыяд пасяўной трэба будзе прыцягнуць і тэхніку гарадскіх прадпрыемстваў".

"Слонімскі веснік" ад 11 лютага 1999г.

Ура!

"Прыемна і тое, што сем прадпрыемстваў (Слоніма — **рэд.**) ужо змаглі дасягнуць узроўню вытворчасці таварнай прадукцыі 1990г."

"Слонімскі веснік" ад 16 лютага 1999г.

МИХАИЛ ЧИГИРЬ:

"Я готов к любому развитию событий"



Экс-премьер Михаил ЧИГИРЬ, первым из белорусских политиков объявил о своем намерении принять участие в новых президентских выборах, которые должны состояться 16 мая этого года.

— Как вы относитесь к решению Центризбиркома о назначении выборов на 16 мая?

— Только положительно.

— И будете участвовать в этих выборах?

— Да, да и да.

(Продолжение на 3 стр.)

НАВІНЫ

Заробак — харчамі

У калгасе імя Чапаева Мастоўскага раёна жывёлаводам заробак за снежань мінулага года выдалі натурай.

У прыватнасці, людзям далі цукар, грэчку, маянэз і па паўтаралітровай пляшцы напою.

Іван МІЛАСНІЦКІ

Злодзеі святла

Летась работнікі слонімскага раёна электрасетак зафіксавалі 313 выпадкаў крадзяжу электрычнасці.

Усе злодзеі аштрафаваны на суму 1 мільярд 280 тысяч рублёў. Каб спагнаць з іх штраф, энергетыкам даводзіцца звяртацца нават у пракуратуру. За няўплату электрычнасць адключаюць без папярэджанняў. А за паўторнае падключэнне трэба заплаціць 1 мільён 200 тысяч рублёў.

Алег ТАЧОНЫ

СЛОНІМЕЦ ГЕОРГІЙ ЗАЗУЛЯ 25 ГАДОЎ ПРАЖЫЎ У БУЭНАС-АЙРЭСЕ

Куды толькі не закідваў лёс нашых землякоў у пошуках лепшае долі! Англія, Нямеччына, ЗША, Канада, Аргенціна. Там ім давалі прытулак, і тая краіна станавілася другой Радзімай. На чужыне яны ўладкоўвалі сваё жыццё, тут нараджаліся іх дзеці і ўнукі. Многія ніколі так і не вярнуліся на Бацькаўшчыну...

Цыганка наваражыла...

Бацькі Георгія Зазулі жылі ў вёсцы Хмяльніца Слонімскага раёна. Мелі пяць гектараў зямлі і паўтара — лесу. Але ўсё гэта яны прадалі ў 1937 годзе, каб аплаціць свой пераезд у Аргенціну. А з выездам атрымалася так.

У сям'і Зазуляў памерлі дзве дзяўчынкі. А калі Фядора Зазуля была цяжарная, завітала да іх у хату старая цыганка, апранутая ў лахманы. Накармілі яе. Яна між іншым распытала пра іх сям'ю. Пасля кажа: "Едзьце адсюль. Нехта пракляў вас. Мяняйце край, бо загіне і гэта дзіця". Так бацькі і зрабілі. Спачатку хацелі ехаць у Канаду, але, каб патрапіць туды, трэба было заплаціць гарантыйны ўзнос. Тады вырашылі ехаць у Аргенціну, дзе жыў дзядзька Пятро Серы, які выехаў за мяжу яшчэ ў 1920-х гадах.

(Працяг на 4 стр.)

НАВІНЫ

Актавы дзень у духоўнай семінарыі

Свята ў Жыровіцкай духоўнай семінарыі ў памяць нябесных заступнікаў гэтай духоўнай школы хрысціцеляў Васіля Вялікага, Рыгора Багаслова і Івана Залатавуста адбылося 12 лютага.

Святкаванне пачалося з боскай літургіі, якую правёў мітрапаліт Філарэт.

За святочным абедам навучэнцы, выкладчыкі і госці семінарыі сабраліся ў дзвюх новых залах, якія да гэтага дня былі пабудаваны на ахвяраванні мінскага завода халадзільнікаў "Атлант".

З прамовай на тэму "Гісторыя першага адраджэння Мінскай духоўнай семінарыі 1946-64 гадоў" выступіў былы выпускнік семінарыі, дацэнт Маскоўскай духоўнай акадэміі Віталь Антонік.

Гасцямі семінарыі ў гэты дзень былі пасол Грэцыі ў Беларусі Гумас Панаісіс, протаіерэй Фёдар Поўны, які ахвяраваў на патрэбы гэтай навучальнай установы канцтавараў на суму 64 мільёны рублёў, і намеснік старшыні слонімскага гарвыканкама Аляксандр Тарсуноў.

Свята скончылася ўвечары канцэртам хору рэгенцкай і нядзельнай школаў.

Мікола КАНАНОВІЧ

КУРСЫ ВАЛЮТ

по состоянию на 16.02.99 г. (в тыс.руб.)

	USD		DEM		RUR	
	Пок.	Прод.	Пок.	Прод.	Пок.	Прод.
"Беларусбанк"	260	270	150	156	11,2	11,7
"Белагропромбанк"	265	–	153	–	11,0	–
"Приорбанк"	265	270	152	156	11,0	11,8
	290*	–	165*	–	11,0*	–
"Белпромстройбанк"	265	270	153	156	11,1	11,8
Курс "черн. рынка"	280	310	155	–	11,0	–

** – при обмене 100 долларов и более*

ЗАГЛЯНЕМ НА РЫНОК

цены (в тыс.руб.)

	11.01.98	14.02.99		11.01.98	14.02.99
бананы	-	300	сметана	50	120
апельсины	270	250-270	масло сл.	260	280
яблоки свежие	80-130	100-180	творог	50	60
сухофрукты	50-70	90-100	яйца (1дес.)	100	95-100
морковь	15-20	30	картофель	-	15
чеснок	250	300	свекла	-	30
лук	45-50	130	грибы суш. (1 кг)	-	2,5млн.
мед нат. (1кг.)	750	800	пшеница	-	15
свинина	160-490	450	ячмень	-	14
сало	300	320	говядина	-	350
молоко	15	15			



© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

НАВІНЫ

Бацькі і дзеці

У мінулым годзе Дзятлаўскі суд пазбавіў бацькоўскіх правоў трох жанчын і аднаго мужчыну.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Эканомія

Мастоўскія энергетыкі пачалі эканоміць электраэнергію.

Калі раней вулічнае асвятленне выключалася ў дзве гадзіны ночы, то цяпер адразу апоўначы.

Антон МАКЕЙ

Анатоль Верабей — лаўрэат

Саюз беларускіх пісьменнікаў прысудзіў прэмію імя Уладзіміра Калесніка літаратурнаму крытыку Анатолю Верабʼю за кнігу "Абуджаная памяць", дзе аўтар даследуе творчасць Уладзіміра Караткевіча.

Анатоль Верабей родам з Мастоўшчыны. Нарадзіўся ў вёсцы Вайнілавічы. Вучыўся ў Курылавіцкай сярэдняй школе. Закончыў Белдзяржуніверсітэт, потым аспірантуру, абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Язэп ПАЛУБЯТКА

У музей, як у школу

У Дзятлаўскім музеі арганізаваны заняткі па гісторыі.

Там вывучаюць мінуўшчыну Дзятлаўшчыны. Дзеці ўжо праслухалі лекцыі па тэмах "Першыя людзі на тэрыторыі нашага краю", "Утварэнне Вялікага княства Літоўскага і Дзятлава ў яго складзе" і іншыя. Заняткі вядуць супрацоўнікі музея.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Паэты "чыстай красы"

Супрацоўнікі Дзятлаўскай раённай бібліятэкі рыхтуюць да друку кніжкі мясцовых паэтаў, якія ўслаўляюць родную прыроду.

Пабачаць свет вершы Георгія Шундрыка, Віктара Шымука, Яўгена Матвеева, Алены Майко і іншых аўтараў.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Сколько нас?

По данным Министерства статистики и анализа Беларуси, на 1 января 1999 года численность населения Беларуси составила 10 млн. 179,5 тыс. человек.

Это на 24,3 тысячи человек меньше, чем на 1 января 1998 года.

В прошлом году в Беларуси родилось 93.236 человек, умерло — 137.433.

БелаПАН

Камп'ютэры затрымліваюць зарплату

У акцыянерным таварыстве "Мастоўдрэў" затрымалі выплату заробнай платы.

Як патлумачылі рабочым у бухгалтэрыі прадпрыемства, гэта звязана з заменай камп'ютэраў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Клопат

Па-сапраўднаму паклапаціліся пра састарэлых у Мастоўскай краме "Ветэран".

Каб нямоглыя людзі дачакаліся сваёй чаргі па танную каўбасу, у гандлёвай зале паставілі драўляную лаўку, бо не ўсе могуць выстаяць гадзіну-другую. Так у горадзе з'явілася "сядзячыя" чэргі.

Антон МАКЕЙ

Цуда-шашкі

У Слоніме прайшло першынства горада па шашках сярод школьнікаў, якое праводзілася ў рамках праграмы клуба "Цуда-шашкі".

У выніку, мацнейшымі сярод адзінаццаці каманд сталі шашысты СШ№10 (Сашко Павел, Сакалоўскі Яўген, Казялецкі Аляксандр, Плакушчы Дзяніс, Барысік Ганна, Амагамедава Кацярына), на другім месцы каманды СШ№4, а на трэцім — СШ№9.

У асабістым заліку першыя месцы на сваіх дошках занялі: Сяргей Чэкан (СШ№3), Лагоша Сяргей і Ярашэвіч Дзяніс (СШ№8), Куцэвіч Юрый (санаторная школа-інтэрнат), Барысік Ганна і Амагамедава Кацярына (СШ №10).

Пераможцы спаборніцтваў былі ўзнагароджаны прызамі гарвыканкама.

Аляксандр АНІСЬКА

Спасем озон

Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды выделило 20 млрд.руб. государственному предприятию «Слонимская райагропромтехника» и ОАО «Несвижская райагропромтехника» для начала модернизации нового холодильного оборудования.

Специалисты Минприроды считают, что проведенное техническое переоснащение этих предприятий позволит значительно сократить применение озоноразрушающих веществ. Как известно, Слонимская райагропромтехника специализируется на ремонте и производстве холодильного оборудования для молочно-товарных ферм.

БелаПАН

СЛОНІМ

нашы людзі









ВСТАТЬ! СУД ИДЕТ

ПРИЗНАТЬ ВИНОВНЫМИ...

В Слонимском городском суде шло слушание двух уголовных дел.

По первому судили водителя автомобиля, который сбил на улице девочку, причинив ей телесные повреждения. Суд назначил водителю наказание в виде лишения свободы сроком на полтора года условно. Вслед за первым процессом начался следующий: два парня обвинялись в краже денег у жителей деревни Новые Девятковичи. Суд, изучив обстоятельства дела, принял во внимание молодость подсудимых и то, что преступление ими совершено впервые, приговорил Сергея Люляка и Андрея Сутько к трем годам лишения свободы условно. На первый взгляд, казалось бы, родители и родственники подсудимых должны быть удовлетворены решением суда: ведь оба парня не оказались за решеткой, хотя совершили тяжкое преступление. Однако, вместо этого они стали обсуждать приговор суда, уповая на суровое наказание, вынесенное их сыновьям. Дескать, водителю за причиненные девочке телесные повреждения суд вынес более мягкий приговор. А тут, мол, за кражу каких-то семи миллионов рублей такое наказание. Невдомек родителям, что не будь это преступление раскрыто, пенсионеры Ляшевичи остались бы без средств к существованию. А сюжет этого преступления начал завязываться в ночь с 27 на 28 января 1998 года.

В клубе деревни Новые Девятковичи гуляла молодежь. Веселье затянулось далеко за полночь. Были на танцах и двое закадычных друзей: 20-летний Сергей Люляк и 18-летний Андрей Сутько. Люляк был навеселе. Дома, во время ужина, добродушный отец налил ему стаканчик. Но в клубе, после нескольких выходов в танцевальный круг, хмель у парня почти прошел. Вот тут-то и предложил Люляк Сергею Сутько:

— А не выпить ли нам с тобой по стаканчику?

И он стал быстро посвящать Сергея Сутько в суть своего плана.

— Днем видел я, как старикам Ляшевичам сын привез из Слонима комбикорм для свиней, украдем его и обменяем на самогон.

После чего друзья быстрым шагом направились к усадьбе Ляшевичей. Бесшумно зашли во двор, стали осматривать дверь сарая. Но к великому их сожалению, дверь была закрыта на большой навесной замок. Это немного обескуражило юношей, но не надолго. У Люляка мгновенно созрел иной план — забраться в дом пенсионеров и украсть что-либо оттуда. Люляку, плотнику МПМК-163, в считанные минуты удалось извлечь раму из окна веранды, куда заскочил одним махом. Да вот в темноте задел ногой молочный бидон.

Хозяева спали чутко и услышали грохот на веранде. Быстро набросив на себя одежду, включив везде свет, они первым делом решили проверить, не залез ли кто-нибудь в сарай. Люляк в это время затаился за дверью и ждал, когда старики выйдут за порог дома. В его голове возник новый план: пока старики будут на улице, пошарить в доме. Люляк хорошо понимал, что пожилые люди не прячут далеко свои сбережения. Первым делом воришка заглянул в одежный шкаф. Просунул руку под немудреные пожитки в один угол, во второй и нашел то, что искал — аккуратный сверток с деньгами...

Во время слушания дела один из членов суда задал подсудимому Люляку вопрос:

— А не думал ли ты, что Ляшевичи застанут тебя в доме?

— Что старики смогли бы со мной сделать?

Люляк успел выскочить из дома перед самым носом у хозяев, которые, не обнаружив ничего подозрительного возле сарая, вернулись в дом.

В темноте Ляшевичи не узнали своего односельчанина, который пулей выскочил на улицу. Только и смогли старики прокричать вслед грабителю пару неласковых слов.

Отбежав на значительное расстояние и отдышавшись, Люляк принялся пересчитывать добычу.

— Семь миллионов девятьсот тысяч, — произнес Люляк. — Завтра утром поделим деньги по-братски, — заверил он Андрея Сутько.

Андрей неожиданно попросил у него:

— Дай мне сегодня, хотя бы сто тысяч!

— Я сказал завтра! — отрезал Люляк.

Придя домой, он сунул в руки разбуженной матери часть денег. Она взяла их, как ни в чем не бывало, вместо того, чтобы спросить у сына, почему это он глубокой ночью решил порадовать ее приличной суммой.

Местный участковый инспектор сработал четко. Не успел утром Люляк на автобусной остановке вручить Сутько 2300 тысяч рублей, как страж порядка обоих высадил из автобуса, который направлялся в Слоним, и доставил их в милицию.

Валентин ЧУРИЛО

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.
Юрыдычны адрас: г.Слонім, Брэцкая,109/12
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас для пісем: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны:
рэдакцыі............ 2-14-39
............(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39
E-MAIL:gs@irex.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 17 лютага 1999г.
Час падпісання 8:00.
Надрукавана ў Баранавіцкай узбуйненай друкарні, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80.

Падпісны індэкс 64042.
Наклад 7.200 экз.
Заказ № 418
© «Газета Слонімская». Спасылка на «ГС» абавязковая
Ⓡ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

© PDF: Kamunikat.org 2016
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

МИХАИЛ ЧИГИРЬ: "Я готов к любому развитию событий"

— Некоторые начинают предвыборную гонку ради саморекламы, действуя по принципу "не добежим — так согреемся". Как вы расцениваете свои шансы на победу?

— Если бы не оценивал свои шансы высоко, не ввязывался бы в эту драку. Я работаю в солидной европейской компании, получаю хорошую европейскую зарплату... То есть в личном плане устроен вполне нормально. Но в той же Германии или России, где я сейчас работаю, мне как гражданину Беларуси порой становится даже стыдно. Когда говорю там, что белорус, вижу одну и ту же реакцию: мои собеседники не понимают, почему в центре Европы образовалась такая "черная дыра". И надо что-то делать, чтобы изменить ситуацию.

— Официальные власти как-то отреагировали на ваше заявление о желании стать президентом?

— Нет. Ну что вы! По мне, как когда-то в Лиозно, никто не стрелял, все тихо и спокойно.

— Сегодня в распоряжении президента Лукашенко находятся серьезные финансовые ресурсы и вышколенный государственный пропагандистский аппарат. У вас ничего подобного нет. Поэтому ситуация с президентскими выборами весьма напоминает казахстанский вариант. Может так случиться, что вы невольно способствуете президенту в его стремлении легко выиграть выборы и стать легитимным главой государства на очередные пять лет?



Фото IREX/ProMedia

— Нынешняя ситуация в стране — это повторение 1994 года. Тогда находившийся у власти Вячеслав Кебич тоже имел ресурсы, мощный государственный аппарат и, тем не менее, проиграл с большим шумом и треском. Проиграл потому, что экономическое положение сделало поражение неизбежным; потому, что народ захотел изменить свою жизнь. Сейчас сложилась аналогичная ситуация. Поэтому ресурсы — и финансовые, и пропагандистские — опять становятся во многом вторичными.

— Рейтинг президента никогда не опускался ниже 30%, в то время как ваш находится в области статистической ошибки. Весь электорат оппозиции по самым оптимистическим оценкам составляет не более 20%. Каким образом вы намерены добиться доверия не определившейся части избирателей, а это почти половина всех, имеющих право голоса?

— У Лукашенко было 60% сторонников, сегодня — 30%. После посевной их будет 15%. Я же только недавно заявил о своем желании баллотироваться в президенты, о чем, наверное, 60% избирателей вообще не знают. Популярность Лукашенко сохраняется лишь потому, что люди пока не видят альтернативного варианта, так как электронные СМИ полностью монополизированы. Сейчас президент стоит перед необходимостью нового резкого повышения цен. Если это произойдет, то вызовет волну недовольства, — народ к этому не готов. С другой стороны, если цены не поднять, — полностью провалится производство. Одним словом, Лукашенко попал в такой тупик, в такой капкан, что не знает, как из него найти выход. Я уверен, что ситуация с его и моим рейтингом будет меняться.

В свою очередь, самый главный козырь, о котором я намерен говорить постоянно — то, что когда я находился во главе правительства, то смог обеспечить среднюю заработную плату в 100 долларов в месяц. А после моего ухода из-за непродуманных действий президента и правительства зарплата уменьшилась на 20-30 долларов. Этот аргумент понятен любому и каждому.

— Экономическое положение почти в каждой белорусской семье действительно ухудшилось. Однако вовсе не факт, что стихийное недовольство масс будет направлено именно на Лукашенко. Ему ведь неоднократно удавалось переводить такое недовольство на других политических субъектов.

— Считаю, что все его лимиты запасных врагов — банкиров, оппозиционеров и т.п. — уже исчерпаны. Найти еще кого-то на данном этапе очень сложно, поэтому как вариант отвода удара от себя Лукашенко и предложил так называемое объединение с Россией. По-моему, этот шаг не принес ему успеха, а наоборот, понизил его рейтинг. Чем может нам помочь сейчас Россия, если размер ее бюджета меньше бюджета Финляндии или Чехии?

Следует помнить и о том, что самая главная оппозиция сейчас находится в аппарате Лукашенко. Это те люди, которые расставлены вокруг него и которые вместе с ним довели народ до такой жизни. Ведь спросите сегодня любого милиционера, за кого он будет голосовать, если дойдет до урны. Да ни один не проголосует за Лукашенко, потому что сегодня семью не в состоянии содержать. То же самое и в армии, и в правоохранительных органах. В таможенном комитете три года назад получали по 250 долларов, а сейчас по 50.

— Михаил Николаевич, у вас отсутствует опыт публичной политики. Как мне представляется, вы — классический аппаратный руководитель. Александр же Лукашенко — как к нему ни относись — образец яркого публичного политика, умелого полемиста. Вы не боитесь выйти вместе с ним в прямой эфир и в открытой дискуссии доказать, что его политика плохая, а ваша будет лучше?

— Лукашенко никогда не пойдет со мной на открытый диалог. Наверное, он будет избегать этого всеми силами и средствами. Ведь в любом прямом эфире он проиграет мне мгновенно. Потому что я знаю прекрасно экономическую статистику. Знаю причины, почему средняя зарплата упала в 5 раз. Он ничего этого не знает и не сможет объяснить и убедить кого-то. Когда мне дали несколько секунд на ОРТ, я задал Лукашенко всего один только вопрос: "Где двести миллионов долларов, оставшиеся в казне на момент моего ухода?". И Лукашенко не нашел ничего лучшего, как соврать, что деньги есть. Хотя в отчете Нацбанка прямо записано, что совокупные обязательства государства уже превысили имеющиеся валютные резервы.

Когда я пришел работать в правительство, у нас с Лукашенко была договоренность — Чигирь не лезет в политику и занимается только экономикой. Мною такая договоренность соблюдалась до самой отставки. При этом я никогда не выставлял на показ положительные моменты, достигнутые в результате деятельности правительства, не говорил, что, например, я поехал в Давос и привез оттуда медицинское оборудование на 7 млн. долларов. В прошлом году туда же съездил президент и "привез" международный скандал.

(Продолжение на 9 стр.)

ФЕЛЬЕТОН

ПАЛЯВАННЕ НА ПАЛЯЎНІЧЫХ

Баба Яга выпаліла ў печы, наварыла атрутнага зелля для рознай варажбы, а Кашчэя ўсё не было. Яна выйшла на ганак сваёй хаткі на курыных ножках і, прыклаўшы далонь да лоба, стала ўзірацца ў лясны гушчар. Нарэшце затрашчалі сухія галіны і на палянку прадзёрся Кашчэй.

— Гэта ты так спяшаешся, лайдак! Казаў, што з самага ранку прыйдзеш адрамантаваць мне ступу, звязаць новае памяло, а сам невядома дзе швэндаешся!

— Ат, хандра ў мяне. Не хочацца нічога рабіць. Так і сядзеў бы на трухлявым пні з ранку да змяркання.

— І праўда, нешта ў цябе марны выгляд, — хітра прыжмурылася Яга. — Пэўна, ад таго, што палец аб палец не ўдараеш. Лянота цябе заела. Схадзіў бы на паляванне, дзіка мне падстрэліў. Так ужо надакучыла гэта нішчымная заечая капуста. І сам бы мяса паеў.

— Ідзі ты к чорту! — абурыўся Кашчэй. На паляванне яна мяне пасылае. На кабана. А ты ведаеш, што мне за гэта можа быць?

— Дык ліцэнзію купі. І нічога не будзе.

— Вельмі ты ў гэтым разбіраешся. Не будзе. Яны таксама мелі ліцэнзію і таксама думалі, што нічога не будзе. Аднак жа было!

— Толкам растлумач, стары! Балбочаш як цецярук. Нічога зразумець не магу.

— Слухай толкам. Паляўнічая брыгада набыла разавы дазвол на адстрэл дзікоў у лясным масіве "Завань", што ў Дзятлаўскім раёне. Разам з імі быў і егер. Ён вызначыў паляўнічых, якія будуць стаяць на нумарах, і якія ў загоне. Усе занялі свае месцы і пачалі чакаць. Праз некаторы час у сектар палявання выбег кабан вагой на пяць пудоў. Быў ён на адлегласці 40 метраў ад паляўнічых. Адзін з іх ускінуў ружжо і стрэліў. Кабан упаў.

— Вось здорава! — задаволена пацерла рукі Баба Яга. — Малайчына! Ты б прамахнуўся, старая дзеравяка.

— А ты думаеш, надта добра, што той пацэліў? Каб прамахнуўся, то быў бы шчаслівейшы.

— Чаму гэта? — занепакоілася Яга.

— Слухай далей. Калі паляўнічыя падышлі бліжэй да кабана, то ўбачылі, што не кабан гэта, а свіння.

— Ну дык і што?



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

— А тое, што страляць свінню можна толькі тую, якая нарадзілася ў год палявання, маладзенькую, словам. А гэта была не зусім маладзенькая, самка ўжо. Па закону іх забіваць нельга. А кабаноў можна, хоць і старэйшых.

— Ну і балда ж ты, Кашчэй! Хіба можна на адлегласці 40 метраў адрозніць кабана ад свінні?

— І я думаю, што нельга, а вось ёсць людзі, якія паляўнічых абвінавацілі ў парушэнні закона.

— Сур'ёзна?

— Сур'ёзней і быць не можа. Інспектар Дзятлаўскай раённай інспекцыі аховы навакольнага асяроддзя і інспектар РАУС вечарам таго ж дня прыбылі ў вёску Дварэц, дзе незадоўга да гэтага была асвежавана туша дзіка. Егер у адпаведным дакуменце напісаў, што застрэлены кабан гэтага года нараджэння. Шчыра кажучы, ён не ведаў, што там пісаць, раз выйшла такое непаразуменне.

— Ніякага граху няма. Тая няшчасная свіння сама выпадкова пад кулю трапіла.

— Гэта ты так разважаеш, і я так, а вось начальнік інспекцыі і інспектар РАУС сказалі і зрабілі зусім інакш. Яны забралі ў паляўнічых дазвол на адстрэл кабаноў, праверылі месца асвежавання тушы і пачалі сцвярджаць, што былі забіты два дзікі і што, маўляў, у іх ёсць сведкі, і запатрабавалі, каб паляўнічыя прызналі сваю віну.

— Якую?

— Тую, няцямля, якой не было. Але ж ведаеш, як іншы раз у жыцці здараецца. Прызнавайся, а то горш будзе.

— Ну, і што паляўнічыя?

— Нічога. Маўчалі. А неўзабаве іх паклікалі ў Дзятлава і на таго паляўнічага, які застрэліў свінню, быў складзены пратакол. Маўляў, застрэліў яе незаконна.

— Нічога сабе! Дык ліцэнзія ж была.

— Не перабівай, баба! І ліцэнзія была, і ўсё было, як трэба. Бяда толькі ў тым, што свіння падкруцілася пад ружжо. Тым не менш, на беднага паляўнічага быў накладзены штраф у памеры трыццаці мінімальных заробкаў плюс кошт мяса. У егера і ў таго чалавека, які страляў, забралі ружжы.

— Вось табе маеш! Я думала, што толькі ў нас, у лесе, робіцца абы што, а тут, бачыш, і ў гарадах не лепш. Не разумею толькі, чаму тыя паляўнічыя ў Дзятлаўскі суд не падалі на незаконныя дзеянні начальнікаў.

— Не хвалюйся, баба, падалі. Не дурныя ж яны цярпець і плаціць штрафы невядома за што.

— Малайцы! — пахваліла Яга. — Я разумею, прыроду трэба ахоўваць ад браканьераў, але ж тут не той выпадак, каб з людзей дзерці штрафы. Людзей, між іншым, таксама трэба берагчы.

— Разумныя словы! Ты, Ягуша, стала перавыхоўвацца, дабрэйшай стала.

— Ат, не падлізвайся. Ну, і што суд?

— Суд адмяніў пастанову начальніка Дзятлаўскай раённай інспекцыі аб спагнаннях і вынес у яго адрас прыватнае вызначэнне, у якім патрабуе звярнуць увагу начальніка Дзятлаўскага РАУС і старшыні Гродзенскага абласнога камітэта аховы навакольнага асяроддзя на парушэнне адміністрацыйнага заканадаўства, дапушчанае інспектарам РАУС і начальнікам Дзятлаўскай раённай інспекцыі, вырашыць пытанне аб прыцягненні іх да дысцыплінарнай адказнасці і паведаміць пра гэта ў суд.

— Ну і добра! Усё такі ёсць на свеце справядлівасць, — абрадавалася Яга.

— А ты думала? Канешне ёсць, але за яе трэба змагацца. Добра, што паляўнічыя — хлопцы смелыя і змаглі за сябе пастаяць. А каб каго рахманага, то і задзяўблі б гэтымі штрафамі.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2016
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

Газета Слонімская
18 — 24 лютага 1999г., № 8 (89)

СЛОНІМЕЦ ГЕОРГІЙ ЗАЗУЛЯ 25 ГАДОЎ ПРАЖЫЎ У БУЭНАС-АЙРЭСЕ

Пра беларускія клубы

У Аргенціну Зазулі прыехалі ў 1937 годзе, а ў наступным, 1938-ым, нарадзіўся хлопчык, якога назвалі Георгій...

— Спачатку бацька працаваў на будоўлі, а з 1940 года — у фірме яўрэя Кнайпеса, дзе рабіў на штамповачным станку аж да выезду ў СССР. За 16 гадоў бацька толькі паўдня не быў на працы. Здароўе моцнае меў, такое і мне дасталося, — расказвае Георгій Зазуля.

Недзе з сярэдзіны 1930-х гадоў у Буэнас-Айрэсе існаваў Беларускі клуб імя Івана Луцкевіча (вядомага дзеяча, аднаго са стваральнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі). Туды хадзілі беларусы, украінцы, каб сустрэцца, пагаварыць, паспяваць свае песні, пачытаць беларускія газеты. Сітуацыя змянілася ў 1946 годзе, калі ў Буэнас-Айрэсе было адкрыта савецкае пасольства, якое дамаглося закрыцця "нацыяналістычнага" беларускага клуба імя І. Луцкевіча. Замест яго ўтварылі беларускі клуб імя Максіма Горкага. Тых беларусаў, якія не захацелі ў яго ўступіць, называлі "фашыстамі"...

— Бацька толькі раз быў у гэтым савецкім клубе, — успамінае Г. Зазуля. — Зайшоў і, як убачыў партрэты Леніна і Сталіна, сказаў, што яго нагі там больш не будзе. Ён быў вельмі рэлігійным чалавекам, выпісваў царкоўную эміграцыйную газету "За правду", дзе часта пісалася пра зверствы бальшавікоў у гады грамадзянскай вайны. Я яшчэ пытаўся ў бацькі: — Як ты чытаеш гэтую фашысцкую газету?.. Гэта мяне ў савецкім клубе зрабілі камсамольцам, напічкалі камуністычнай ідэалогіяй. А аказалася, што менавіта тая газета пісала праўду...



Сябры Беларускага клуба імя Івана Луцкевіча. У першым радзе сёмы злева Георгій Зазуля. Буэнас-Айрэс, 1940 г.

Выезд у "савецкі рай"

У клубе імя Горкага, як і ў іншых падобных прасавецкіх арганізацыях, ішла ідэалагічная "апрацоўка" людзей. Іх агітавалі выязджаць у Савецкі Саюз. Рабіліся цэлыя "спектаклі". Напрыклад, у 1949 годзе ў Буэнас-Айрэс прыехалі савецкія папы, якія адкрылі на вуліцы Бульнэс праваслаўную царкву. У яе дэманстратыўна хадзілі "маліцца" савецкі пасол і консул, якія гэтым спрабавалі абвергнуць чуткі пра пераслед рэлігіі ў СССР. А многія эмігранты былі веруючымі, яшчэ на пачатку стагоддзя яны пабудавалі ў Буэнас-Айрэсе на вуліцы Брасіль праваслаўную царкву. Як гавораць, пры садзейнічанні самога расійскага імператара Мікалая II.

— Аднойчы я прынёс з клуба газету "За возвращение на Родину", у якой быў ліст нашага знаёмага, што ўжо пераехаў у СССР. Бацька прачытаў той ліст і кажа: — Не веру! Гэта без яго напісана, гэта лухта, бо ён і двух слоў звязаць не мог, — успамінае Георгій Зазуля. — А я агітаваў бацьку ехаць у СССР. Ён не хацеў. Тады кажу: — Тата, калі не паедзеш, я пайду і кінуся пад цягнік. — Сынок, не трэба! Паеду. Але ты едзеш на сваю пагібель. Ты там сабе жыццё не ўладкуеш... Гэта былі прарочыя словы.

Усю дарогу многім эмігрантам, якія вярталіся ў СССР, аплаціла савецкая ўлада. Тры рэйсы зрабіў аргенцінскі карабель, які быў наняты саветамі. У 1955-56 гадах у Адэсу было перавезена каля трох тысяч чалавек з Аргенціны. Усе яны імкнуліся ў "савецкі рай"...

Расчараванне

Георгій Зазуля ў Слоніме спачатку працаваў вучнем на аўтабазе. Пасля скончыў курсы шафёраў у Гродне і працаваў па спецыяльнасці. У снежні 1957 года яго прызвалі ў савецкую армію. Служыў у Тбілісі. Нярэдка здараліся канфлікты з афіцэрамі, калі тыя бралі салдат працаваць у сябе дома. "Што я — у армію прыйшоў дровы пілаваць, падлогу мыць, а не вайсковую справу вывучаць?" — пытаўся Г. Зазуля. Праз дзень хадзіў ён у нарады пасля гэтага... Хутка яго дэмабілізуюць па "хрушчоўскаму" скарачэнню савецкай арміі.


Аднак праз нейкі час Георгія выклікалі ў слонімскі ваенкамат. — Пойдзеш зноў служыць. Ты мала служыў! — гаворыць ваенком маёр Сцяпанаў. — Пакуль у газетах не напішуць, што пастанова Савета Міністраў пра скарачэнне арміі адменена, я нікуды не пайду! — сказаў Зазуля. Ваенком, нібыта, званіў удакладніць гэтую справу ў Гродна ды ўзяў з Георгія рубель за тэлефонныя размовы... У армію яго больш не прызывалі.

Зазуля нейкі час працаваў пад Ташкентам, а пасля зноў вярнуўся ў Слонім, уладкаваўся на мэблевую фабрыку. Але хутка стаў сумаваць Георгій па Аргенціне. І не ён адзін. Многія з тых, хто вярнуўся, зноў хацелі ўцячы з краіны саветаў.

Футбольная кар'ера

Яшчэ ў Аргенціне Г. Зазуля адгуляў адзін сезон за футбольную каманду "Сан-Ларэнса", зламаў нагу. У 1966 годзе журналіст Віктар Яркін напіша ў часопісе "Советский спорт" фантастычную замалёўку "Вяртанне", у якой трыбуны стадыёна ў Буэнас-Айрэсе нібыта заклікалі: "Па нагах рускага!". Гэта была даніна савецкай прапагандзе.

Георгій Зазуля гуляў у футбол ва Узбекістане, дзе ледзь не трапіў у ташкенцкі "Пахтакор", а пасля ў Слоніме выступаў за каманду "Волна". "Я ўмеў добра выбіраць пазіцыі на полі. Але рыўка ў мяне не было. Вось калі мне дакладна давалі мяч у штрафной, я рэдка не трапляў у вароты", — успамінае Зазуля.



Георгій Зазуля (крайні злева) са сваімі сябрамі. Буэнас-Айрэс, 1956 г.

У кастрычніку 1956 года Георгія Зазулю выклікалі ў Мінск на прагляд у мясцовае "Дынама". Далі стыпендыю — 850 рублёў (у той час, калі бацька атрымоўваў 300 рублёў зарплаты). Паспеў згуляць адну таварыскую гульню за "Дынама", адпрасіўся на тры дні, аднак дома затрымаўся на тры тыдні. Усе грошы прагуляў з сябрам у Вільні, а калі яны скончыліся, вярнуўся ў Слонім. Чакаў пакуль бацька атрымаў аванс, бо не было за што заехаць у Мінск. З ім развіталіся.

Наступны раз Зазулю запрасілі ў мінскае "Дынама" у 1966 годзе. У тым сезоне добра гуляла "Волна", якая заваявала кубак горада, раёна, заняла другое месца на кубак вобласці (прайграла ў фінале "Лідзе" — 1 : 3). На праглядзе Георгію ўдалося пагуляць з Малафеевым, Мустыгіным, Зарэмбам, але зноў не ўдалося замацавацца ў камандзе. Вядомыя "дынамаўцы" не хацелі падчас гульні заўважаць Зазулю, не давалі пасоў і, такім чынам, у яго не было магчымасці паказаць сябе.

Георгій Зазуля ўспамінае, што на гульні "Волны" прыходзіла шмат людзей, якія заўзята "балелі" за сваю каманду. Зазуля і Міхаіл Біберыдзе хадзілі да старшыні райвыканкама Віктара Кісялеўскага, прапаноўвалі стварыць, па прыкладу Аргенціны, футбольны клуб, зрабіць білеты на футбольныя матчы, каб зарабіць грошы на пабудову трыбун. "Райфінаддзел пасадзіць вас разам са мною", — адказаў Кісялеўскі. Шмат задумак было ў Г. Зазулі. Напрыклад, планаваў арганізаваць у Слоніме гонкі на матацыклах, зрабіць платны зімні каток. Але ўсе ягоныя прапановы не ўспрымаліся ўладамі, супярэчылі яе прынцыпам.

Сто лістоў у Вярхоўны Савет

— Пасля таго, што тут убачыў, я вырашыў зноў ехаць у Аргенціну, — гаворыць Георгій Зазуля. — Кожны тыдзень пісаў лісты ў Вярхоўны Савет СССР. Усяго іх напісаў 96. І мне пашчасціла — выпусцілі, адным з першых з Беларусі. Ужо пасля мяне выехалі "аргенцінцы" з Брэста, Баранавіч, Мінска...

Зазуля вярнуўся ў Буэнас-Айрэс разам з жонкай і двума дзецьмі. Бацькі засталіся ў Беларусі. Працаваў на двух работах, спаў па 4-5 гадзін у суткі. Фабрыка давала беспрацэнтныя пазыкі для набыцця маёмасці — Зазуля купіў сваё таксі. Пасля купіў у крэдыт дом на добрым участку ў прэстыжным раёне. А пазыкі ў той час аддаваліся лёгка, бо ў Аргенціне, як цяпер у Беларусі, была страшэнная інфляцыя. Спачатку шмат дапамагалі аргенцінцы. Напрыклад, у краме можна было браць прадукты ў крэдыт, пакуль не з'явіліся грошы для разліку.

— Аргенцінцы — выдатныя людзі, — гаворыць Зазуля. — Але ёсць так званыя "жабракі", якія самі хочуць імі быць. Яны адзін дзень паробяць на будоўлі і ім хапае грошай, каб тыдзень піць вінаграднае віно і не працаваць. А пасля гэтыя "жабракі" камуністычныя дэманстрацыі наладжвалі, бо ім "цяжка жыць"... Цікава, што ў Аргенціне ўсіх славян называюць "палякамі", а яўрэяў — "рускімі". У сувязі з гэтым здараецца шмат кур'ёзаў.

У 1975 годзе, калі здавалася, што ўдалося зноў пусціць карані ў аргенцінскую зямлю, Зазулі вярнуліся ў СССР. Як гэта атрымалася? Жончына маці напісала, што хворая на рак, і што няма каму яе пахаваць. Пісала, што "жыццё тут выдатнае і ў магазінах ёсць усё, былі б толькі грошы". Нават савецкі марак, які гасцяваў у Зазуляў, адгаворваў іх вяртацца: — Куды вы едзеце? Ці ёсць у вас галава?! Аднак яны ўсё ж паехалі.

Сваёй другой Радзіме не здрадзіў

Праз нейкі час пасля вяртання ў Слонім у Зазулі забралі аргенцінскі пашпарт, каб больш не спрабаваў выехаць за мяжу. Хутка яго выклікалі на сесію гарсавета. Старшыня гарвыканкама Васіль Пеляніцын сказаў: "Вось таварыш з Аргенціны прыехаў. Мы вам, таварыш Зазуля, дамо трохпакаёвую кватэру і пяць тысяч рублёў на набыццё мэблі". — Прабачце, а што ад мяне патрабуецца, бо ведаю, што проста так нічога не даюць? — запытаўся Зазуля. "Нічога асаблівага. Будзеце ездзіць па вёсках, выступаць. Расказваць, як дрэнна жывецца ў Аргенціне", — гаворыць Пеляніцын. — Не, мае дзеці там не галадалі. Як я буду маніць? Мае дочкі ў платную школу хадзілі ў Аргенціне, бо бясплатныя там — для жабракоў. Так што, не трэба мне ваша кватэра. Я сваё сумленне не прадаю!..

Хацелі зрабіць перадачу на тэлебачанні, каб Зазуля расказаў пра жыццё ў Аргенціне. Але, калі ён паставіў умову, што хоча паглядзець праграму перад выхадам у эфір, яны паехалі "кансультавацца". Да гэтага часу едуць...

— Аргенціна для мяне свяшчэнная, — гаворыць Зазуля. — Я там нарадзіўся, вучыўся, знайшоў сяброў. І сёння памятаю аргенцінскія песні, іспанскую мову. А многія з тых, хто вярнуўся адтуль у Беларусь, яе ўжо забыліся...

У 1990 годзе Георгій Зазуля паехаў у Аргенціну да сястры. Перад ад'ездам бацька Лук'ян сказаў: "Сынок, запомні. Ты ў мяне апошні сын, і ты павінен мяне пахаваць. З-за цябе я сюды прыехаў". — Добра, не хвалюйся, я вярнуся, — адказаў Георгій. Ён пабыў там паўтара месяца, сустрэў свайго сябра Міхаіла Бурака, які ўгаворваў Георгія застацца, абяцаў яму купіць таксі. Не застаўся, вярнуўся ў Слонім. У 1992 годзе пахаваў свайго бацьку.

Пра свабоду

Георгій Зазуля часта ўспамінае Аргенціну. Яму ёсць з чым параўноўваць жыццё ў Беларусі, а раней — у СССР. Доўгія гады працаваў ён таксістам у Слоніме. Нярэдка гаварыў сваім пасажырам: — Вы шчаслівыя людзі, бо не ведаеце, як дрэнна жывяце...

У 1990 годзе ў Аргенціне прэзідэнтам стаў Карлёс Мэнэм. Яго спачатку не любілі, як выхадца з правінцыі, а таксама за тое, што ён вырашыў навучыць аргенцінцаў працаваць. І ўжо ёсць вынікі. Спынілася інфляцыя, аргенцінскі песа выраўняўся з амерыканскім далярам. А да таго ў Аргенціне дзесяцігоддзямі існаваў "чорны рынак" са сваімі курсамі валют. Мэнэма абралі прэзідэнтам на другі тэрмін. Ён здолеў спыніць ваенныя перавароты ў краіне, скараціўшы армію і генералітэт, з якога можна было сфарміраваць дывізію... Пры Мэнэме аргенцінцы атрымалі сапраўдную свабоду. Свабоду не на словах, а на справе. На выбарах у органы ўлады не можа быць падтасовак, у прынцыпе. Там на выбарчых участках сядзяць прадстаўнікі ўсіх палітычных партый, якім ніхто не перашкаджае кантраляваць ход выбараў. І аргенцінцы ўжо сталі забываць часы рэжыму генерала Перона і яго славутай жонкі Эвіты (у нядаўна адзнятым фільме пра яе галоўную ролю выканала спявачка Мадона. Г. Зазуля бачыў Эвіту, ужо хворую, на мітынгу ў Буэнас-Айрэсе, а пасля быў на яе пахаванні). Міф пра Перона, які правіў у Аргенціне ў 1946-55 гг., жыў даволі доўга. Спачатку ён быў прыхільнікам фашызму, а пасля 1945 года "палявеў", пасябраваў з Масквой. Выдатна валодаючы майстэрствам папулізму, Перон заваяваў усенародную любоў. Карыстаючыся тым, што пасля вайны эканоміка еўрапейскіх краін яшчэ не аднавілася, Перон здолеў добра нажыцца на бядзе іншых народаў, прадаючы ім дарагія тавары. За кошт гэтага ў аргенцінцаў склалася ілюзія пра ўсеагульны дабрабыт. Але праз нейкі час прыйшло расчараванне Перонам, якога раней усе любілі. Цяпер людзі пачалі разумець, што былі ім падмануты...

У Беларусі, здаецца, і народ працавіты, і генералаў не так ужо і шмат, і прэзідэнт ёсць — выхадзец з правінцыі, але жыццё становіцца ўсё горшым. Можа таму, што не хапае свабоды?

Сяргей ЁРШ

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

Стоимость объявлений в "ГС" для частных лиц.
Объявление может быть помещено бесплатно. Для этого необходимо вырезать купон бесплатного объявления, заполнить его и отправить по почте или же принести в редакцию. **Бесплатные объявления публикуются в порядке очереди по мере поступления.**
Если вы желаете, чтобы ваше объявление было выделено из общего текста, мы предлагаем оформить его в рамку. Эта услуга стоит 250 тысяч рублей. По Вашей просьбе объявление повторяем в бесплатно.
Оформленное поздравление стоит 300 тысяч рублей, поздравление с фотографией — 350 тысяч.

Стоимость рекламных площадей для организаций.
В газете применяется модульный метод размещения рекламы. Размер одного модуля — 4х4 см, его базовая стоимость — 800.000 руб.

Система скидок за: последовательное размещение:	
-5 номеров (месяц)	-10%
-9 номеров (2 месяца)	-15%
-13 номеров (3 месяца)	-20%
-26 номеров (полгода)	-30%
-52 номера (год)	-40%

публикацию рекламных статей -25%
надбавка за публикацию на:


1 полосе	+100%
программе ТВ	+50%

Контактные телефоны:
(01562) 2-14-39 - факс
(017) 210-87-17

Вы хотите поместить объявление (поздравление) не посещая редакцию.
Для этого необходимо перечислить соответствующую сумму почтовым переводом с ближайшего отделения почтовой связи на расчетный счет редакции:
№ 3012014050016 в АСБ "Беларусбанк", филиал 422 в г. Слониме, код 852, и отправить в конверте текст объявления (поздравления) с квитанцией об оплате на адрес редакции:
231800, г.Слоним, ул. Я.Купалы, 5 или г.Слоним-2, а/я 5.
Оплаченные объявления размещаются в нашей газете вне очереди.

● Объявления в текущий номер принимаются до 15.00 каждого вторника ● Платные объявления позже указанного срока принимаются за дополнительную плату +20%

Дорогие папочка и мамочка
Семеновичи Владимир Алексеевич и Галина Адамовна!




От всей души поздравляем вас с днем рождения!

Желаем, чтоб солнце вас согревало,
Чтоб черные тучи вас обошли,
Чтоб счастье с вами все годы шагало,
А беды и горе в дороге не жгли.

Пусть слезы обид на глазах не искрятся,
И пусть не коснется висков седина,
А дни ваши миром и радостью длятся,
Мы рядом с вами — и вы не одни.

С уважением, Олег, Света, Оля и Валентина Андреевна

Дорогая и любимая жена, мамочка, теща и бабушка
Мария Николаевна Кравцевич!



От всей души поздравляем тебя с 45-летием! Желаем крепкого здоровья, успехов в работе и во всех делах, быть всегда такой красивой, и чтобы рядом с тобой всю жизнь были счастья, любовь, радость и удача.

Тебе сегодня 45,
Конечно, ведь не 20.
Зато ты ягодка опять
И рано грусти предаваться.
Пускай блестит седая прядь,
Она, ей богу, украшает,
Тебе ведь только 45
И жизнь так много обещает.

С уважением, муж, сыновья, дочери, зятья, внучки Машенька и Настенька, внук Виталик

Дорогой и любимый муж и отец
Мухаревский Александр Аркадьевич!
Поздравляем тебя с днем рождения!

Пусть счастье, радость и любовь
Всегда под твой приходят кров.
Желаем чаще улыбаться,
По пустякам не огорчаться,
Желаем благ тебе земных,
Мы знаем, ты достоин их.

С любовью, жена Марина, сын Сережа, дочь Оленька

СДАЮ НА ПРОКАТ
КРАСИВЫЕ свадебные наряды.
ул. Железнодорожная,94
Тел. 2-69-20.

Лиц. №18729 от 08.12.97г
СВАДЕБНЫЕ И ВЕЧЕРНИЕ НАРЯДЫ
(пр-во Канады, США)
на прокат.
Тел. 4-20-00. Танкистов, 22.

РАДИОТАКСИ
САДКО
услуги круглосуточно
5-17-20

РАДИОТАКСИ
КРУГЛОСУТОЧНО
ФЕНИКС 2-12-88

НЕДВИЖИМОСТЬ НАДЕЖДА ИНФОРМАЦИЯ
ПОМОЖЕТ избежать неудобств, сэкономит ваше время при купле-продаже, обмене, сдаче в найм квартир, домов, гаражей, дач.
ПРИМЕМ и предоставим информацию о купле-продаже автомобилей и другой техники, запчастей, новой и б/у мебели, бытовой техники, услугах в области медицины, туризма, трудоустройства и многое другое.
"Надежда" — гарант надежности и безопасности любой сделки
Ждём вас по адресу: г. Слоним, ул. Первомайская,5
10.00—13.00; 14.00—18.00 БЕЗ ВЫХОДНЫХ ТЕЛ. 2-11-97

ГАРАНТИЯ И КАЧЕСТВО
ЖАЛЮЗИ
ВЕРТИКАЛЬНЫЕ
ГОРИЗОНТАЛЬНЫЕ
РОЛЛЕТЫ ЗАЩИТНЫЕ
тел. 4-11-72
3-15-46
ОБМЕР И УСТАНОВКА — БЕСПЛАТНО

группа CfS
Тел. 2-60-50
Факс 2-66-50
Лиц. мин.промышленности № 387 от 12.12.97г.
Компьютеры и оргтехника

ГАРАНТ
ПРЕДЛАГАЕТ ЦВЕТНЫЕ ТЕЛЕВИЗОРЫ "ГОРИЗОНТ"
Гарантия полтора года.
Самые низкие цены в городе.
Мы ждем вас по адресу
ул.К.Маркса, 38. Тел. 2-70-38
магазин "Горизонт"
Гарантия полтора года.

ПРОДАЮ

- шубу нутрия (Аргентина), с капюшоном, коричневая, р.52, нов. Тел. 5-13-22 (после 19.00).
- племенных щенков ротвейлера с отл. родословной. Тел. 4-13-18, 2-56-54.
- велосипед дорожный для подростка. Тел. 4-14-06.
- линолеум б/у. Тел. 4-14-06.
- ружье ТОЗ-34 б/у, вертикал., 12 кол., оптич. прицел. Тел. 5-21-95.
- "нитродерм" для лечения ишемической болезни сердца. Тел. 96-5-89.

ВАННЫ ЧУГУННЫЕ Заявки по тел. в Барановичах: т/ф 45-60-40 (до 18.00), 46-07-90 (после 19.00 и в вых. дни). Доставка по РБ БЕСПЛАТНО!

- корову тельную. Тел 4-22-15.
- обои, клей ПВА. Тел. 5-21-86.
- прицеп "Зубренок". Красноармейская, 319.
- молодую кобылу 2,10г. Тел. 2-21-72.
- ванну чугунную нов. Тел. 2-26-78.
- шапку из овчины. Плетницкого, 20.
- ванну чугун., белую, комплектную, люкс, 170см (Россия), 130 у.е. Тел. 2-63-23 (после 20.00).
- баян "Тула". Плетницкого, 20.
- свад. платье р.44-46, 35 у.е. или сдаю 20 у.е. Ершова, 38-2.
- электрошокер. Тел. 2-74-49.
- отрез "мокрого шелка", 3м. Тел. 2-91-67.
- пилы циркулярные. Тел. 2-60-38.
- сапоги зим., натур., р.38, (Германия). Тел. 4-15-36.
- дет. 2-сторонние пуховики, 2,5млн. Тел. 4-15-36.
- пальто зим. жен. (воротник норка), р.52/164, 40 у.е. Тел. 2-24-68.
- станок сверлильный настольный. Тел. 96-2-09.
- газовую колонку нов. Тел. 5-15-20.
- коляску прогулочную (Польша). Тел. 2-94-15.
- 4-комфороч. газ. плиту (малую). Тел. 5-15-20.
- рамы оконные 150х104. пер. Щорса, 14.
- электропривод к швейной машине. Тел. 2-29-94 (после 19.00).
- сено. Тел. 5-28-90.
- коляску дет. (Германия), 10 у.е. Тел. 2-58-53.
- раковину цветную с подставкой для ванной. Тел. 3-16-74.
- станок дерев.-обраб. универ, 380В, 4кВт, 390 у.е. Тел. 3-15-91.
- платье свад., р.46-48. Тел. 2-07-52.
- котел отопительный на жидком топливе. Тел. 73-2-97.
- матрац полуторный нов., 90х186. Тел. 2-57-22.
- трубы ч/к Д=50мм, 100мм. Тел. 2-57-22.
- коляску инвалидную. Тел. 2-20-44.
- свад. наряд (Канада),р.46 или сдаю. Тел. 2-94-34.
- кирпич огнеупорный для печей и каминов. Тел. 98-1-52.
- вытяжку кухонную из оцинкованной жести. Тел. 3-24-97.
- плиты перекрытия 4,20х1,5, 3х1,20. Тел. 2-39-31 (до 8.00, после 21.00).
- газ. плиту, нов. Тел. 4-29-90 (после 15.00).
- электрорубанок нов., 40 у.е. Тел. 2-40-37.
- автоматику газовую для котла АПОК. Тел. 2-24-45.
- металлическую печку-плиту с духовкой и вытяжной трубой. Тел. 2-09-81.
- цветок алоэ-лечебное. Тел. 2-15-74.
- электромотор малообортный. Тел. 2-15-74.
- кровать метал. 1-спальн. с метал. сеткой. Тел. 2-15-74.
- пианино "Беларусь". Тел. 2-45-54.
- медогонку. Тел. 4-27-43.
- станок дерев.-обраб., универ. Тел. 4-11-68.
- газов. плиту (Брест). нов. Тел. 2-05-04.
- газовую колонку. Тел. 2-05-04.
- ванну чугунную, нов. Тел. 2-05-04.
- компрессор 10АТМ, имп. Тел. в Зельве 38-2-16.
- сапоги кирзовые р.46 1,1 млн. Тел. 2-05-80.
- швейную машину (Подольск), ручная, 1А класса. Тел. 2-44-20.
- корову тельную, отел 14 февраля, вместе с кормом. Тел. 91-5-13.
- станок дерев.-обраб., универ. Тел. 2-34-79.
- тренажер для жима лежа со штангой 65 кг, длина грифа 90 см (15 млн). Тел. 2-30-21 (20.00).
- две покрытые козы. Жировичи, ул. Пограничников, 7-58.

Детскую универсальную коляску, качели детские напольные, детский меховой конверт. Тел. 4-24-69.

- палатку (УСБ) брезент нов. Тел. 4-19-22.
- плиту газовую. Тел. 4-28-20.
- прицеп а/м "Зубренок" с техпаспартом. Тел. 2-50-32.
- котел чугунный "Жарок-2". Тел. 2-50-32.
— А вы посмотрите на его последние действия, вы посмотрите на состояние, посмотрите на вид министров, которые дрожат перед телекамерами, и вам все будет понятно. Нет ни одного конструктивного предложения по изменению ситуации в лучшую сторону. Ни одного! Те административные мероприятия, которые провел в последнее время президент, — они же ничего не дали. В Минске в магазинах пустые прилавки, а отъедьте чуть дальше и посмотрите, что делается в районных центрах. Движемся даже не к 1994 году, а к 92-му.

"БДГ"

КНІГА Ў ГАЗЕЦЕ

Васіль СУПРУН. «Дзеі над Шчарай» (З гісторыі зямлі Слонімскай)

21. Камлявічы. За 0,8 кіламетра на поўдзень ад вёскі, на схіле пясчанага ўзвышша (урочышча Загор'е) выяўлены сляды стаянкі каменнага веку з ляпной керамікай і крамянёвымі знаходкамі. Па словах старажылаў, калісьці тут існавалі і курганападобныя скапцы. Бліжэй да Шчары ва ўрочышчы Вомша, — другое селішча пазнейшага часу з ляпной керамікай і крамянёвымі вырабамі. Трэцяе селішча размяшчалася на поўнач ад вёскі, на ўзвышаным левым беразе Шчары. Акрамя ляпной і кружальнай керамікі, тут выяўлены соплы ад домніц і шлакі ад выплаўкі жалеза з балотнай руды.

22. Касцяні. На заходняй ускраіне вёскі, пры поплаве ракі Валобрынкі і на адхоне ўзвышша, — селішча з позняй ляпной і кружальнай керамікай. Сляды другога, больш позняга, селішча выяўлены на ўскрайку дзеючых могілак. Беларускі археолаг М.Чарняўскі на поўнач ад вёскі выявіў невялікі курганны могільнік (са слоў даследчыка).

23. Куцэйкі. На высокім правым беразе ракі Бярозы, на сучасных вясковых могілках, што побач з вёскай, маецца нямала старых магіл з суцэльнай каменнай вымасткай на ўзроўні дняўной паверхні. У апошняе стагоддзе такі абрад пахавання не ўжываецца.

Амаль насупраць могільніка па другі бок ракі, на невысокім пагорачку, — селішча з позняй ляпной і кружальнай керамікай.

24. Масілавічы. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі, прымыкаючай да левага берага ракі Грыўды, — селішча з ляпной і кружальнай керамікай, а таксама шлакам ад апрацоўкі і, магчыма, выплаўкі жалеза з балотнай руды. Ляпная кераміка амаль выключна гладкасценная з дабаўкай жарствы ў гліне.

25. Міжэвічы. На правабярэжжы ракі Грыўды, між руслам яе і старым могільнікам, што пры сучаснай вясковай вуліцы, — сляды селішча з позняй ляпной (ёсць і штрыхаваная), а таксама кружальнай керамікай. Сляды другога селішча з кружальнай керамікай выяўлены на паўночны ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Кут. Тут калісьці была знойдзена каменная сякера.

26. Мілашэвічы. У заходнім канцы вёскі, абапал рачулкі Вяршанкі, — сляды вялікага селішча з позняй ляпной і кружальнай керамікай, а таксама шлакам ад апрацоўкі і, магчыма, выплаўкі жалеза з балотнай руды. Зрэдку сустракаюцца фрагменты позняй паліванай кафлі. Падобнае селішча выяўлена і за 0,4 кіламетра на поўдзень, на тэрыторыі былога памесця.

27. Міцькавічы. За 0,6 кіламетра на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Хваіна паўскрай поплаву ракі Шчары, на пясчанай градзе маецца селішча эпохі бронзы і пазнейшага часу, сустракаецца крамянёвы і керамічны матэрыял як ручнога, так і кружальнага вырабу. Падобная стаянка выяўлена і ва ўрочышчы Яловікі. А за 0,3 кіламетра на поўдзень ад вёскі, побач са старымі васілевіцкімі могілкамі, — сляды селішча з ранняй кружальнай керамікай.

28. Навасёлкі (Паўлаўскага сельсавета). На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, уздоўж рачулкі Вяршанкі, пачынаючы амаль ад шашы Слонім-Дзятлава, — сляды вялікага селішча з ляпной і кружальнай керамікай, а таксама шлакам і плямамі ад домніц па выплаўцы жалеза. Ляпная кераміка гладкасценная і штрыхаваная. На паўднёва захад ад селішча, пры шашы, могільнік з грунтовымі магіламі і некалькімі курганамі. Адзін з курганоў мае ў плане форму сярпа, астатнія круглыя, вышыня насыпаў да 1 метра (часткова знішчаны). Метраў за 800 на ўсход ад згаданага помніка, таксама побач з Вяршанкай, ва ўрочышчы Селішча, — другое селішча з кружальнай керамікай і мноствам шлаку.

Трэці куст па выплаўцы жалеза з мясцовай балотнай руды размяшчаўся за

0,4 кіламетра на поўдзень, ва ўрочышчы Вепраўка (часам называюць Падборце), гэта побач з дрыгвістым балотам, дзе і цяпер шмат балотнай руды. Плошча гэтага рамесніцкага асяродка, існаваўшага недзе ў 12-15 стагоддзях, складае, прыблізна, 200 на 240 метраў. Глеба тут насычана попелам, шлакам, абпаленай глінай, зрэдку сустракаюцца і жалезныя крынцы. Для насельніцтва данай мясціны асноўным заняткам побач з земляробствам была выплаўка і апрацоўка жалеза.

Сляды домніц, кузняў і зашлакаваных мясцінаў засведчаны ва ўсіх навакольных селішчах: каля вёсак Рудня, Паўлава (былыя Пузачы), Мілашэвічы, паўз рэчак Хітра і Дымарка. На Слонімшчыне — гэта найбольш яскрава выражаны куст па выплаўцы жалеза з балотнай руды і яго апрацоўцы ў так званы феадальны перыяд.

29. Навікі. На паўночны захад ад вёскі ва ўрочышчы Вулашно, што прымыкае да поплаву правабярэжжа Шчары, ёсць стаянка каменнага веку са шматлікімі крамянёвымі матэрыяламі, на якіх прыкметны сляды апрацоўкі, аднак керамікі выявіць не ўдалося. Магчыма, стаянка аднасіцца да эпохі мезаліту (8-5 тысячагоддзе да нашай эры, калі керамічныя вырабы яшчэ адсутнічалі).

30. Нагуевічы. У паўднёвым канцы вёскі, на ўзвышаным левым беразе ракі Ісы, побач з мастом — сляды стаянкі эпохі бронзы ці неаліту. Знойдзена невялікая колькасць крамянёвых матэрыялаў і дробныя фрагменты глінянага посуду. За 4 кіламетры на паўднёвы ўсход ад вёскі, на тэрыторыі ўрочышча Івішча, у лесе ёсць курганны могільнік з 16-ці круглых курганоў вышынёй да 1,6 метра. Могільнік складаецца з двух груп. Паблізу працякае безымянная рачулка (Млыноўка?).

31. Ніз. На поўнач ад вёскі, уздоўж высокага пясчанага левага берага Шчары, — некалькі неалітычных стаянак. У асобных месцах на іх наслоены матэрыялы з эпохі бронзы і пазнейшага часу. Крамянёвыя матэрыялы і ляпная кераміка з гладкасценнай і штрыхаванай паверхняй рассыпаны ўздоўж берага на вялікай адлегласці з нязначнымі разрывамі. Фрагменты позняга ляпнога і кружальнага посуду сканцэнтраваны на ўзбярэжжы бліжэй да вёскі. Тут жа, на схіле ўзвышша, — стары могільнік з камянямі. Прыблізна за 1,5 км на поўнач ад вёскі, паблізу хутара Янава, — высокае мысавае гарадзішча з культурным слоем, валам і ровам. Умацаванне пашкоджана больш познімі землянымі работамі.



Галава паганскага ідала, выкапаная ў ускраіне Слоніма

32. Орлавічы. Амаль за кіламетр на паўднёвы ўсход ад вёскі, на дзеючых могілках захавалася яшчэ 52 круглыя ў плане курганы, вышынёй ад 0,8 да 1,7 метра і дыяметрам 4-10 метраў. У розны час пахаванні раскопваліся І.Стаброўскім, Р.Якімовічам, П.Лысенкам і аўтарам; датуюцца, прыблізна, XII-XVII стагоддзямі. Пахаванні як падкурганныя (да 0,5 метра заглыбленыя ў мацярык), так і ўпускныя ў курганы насыпы. Выяўлены рэшткі трун, драўляных вёдраў, гаршкі з ежай, упрыгожванні (плецены бронзавыя і шкляныя пазалочаныя пацеркі), манета XVI стагоддзя і іншае.

(Пачатак у №44-47,51 за 1998 г.).

© PDF: Kamunikat.org 2016
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

ЛЮБИТЕЛЯМ СЕРИАЛА

ТАЙНА "ЖЕСТОКОГО АНГЕЛА"

Уже пятый месяц Общественное российское телевидение транслирует знаменитый бразильский сериал "Жестокий ангел", который уже нашел своих почитателей, преимущественно женщин. Они вместе с его героями разгадывают семейные тайны, переживают и радуются, надеются и любят... Сериал уже выходит на "финишную прямую", и скоро все станет на свои места. А мы сегодня предлагаем нашим читателям сценарную версию окончания "Жестокого ангела".

После раскрытия убийства Жозиаса, была арестована Тиана, которая во всем призналась полиции. Убийство произошло во время их ссоры: Жозиас выманил у Тианы все деньги, обещая жениться на ней и вместе уехать за границу, но обманул... Ниси наняла для нее хорошего адвоката, который надеялся, что суд примет во внимание все смягчающие обстоятельства и квалифицирует это преступление как непреднамеренное убийство.

Постепенно жизнь входила в привычную, естественную колею. Аугусту простил Алзиру и вернулся домой, а Ниси наконец поверила в то, что Родригу любит ее. Луис-Карлус (Лука) и Лижия готовились к свадьбе. Сиру переехал к Дуде без всякой свадьбы. Его больше ничего не связывало с Марилу, которая уехала в Европу с любовником. Жулиу уехал в США, где ему предложили работу фотомодели. Он не хотел больше видеть Ниси и старался ее поскорее забыть. Элен переехала к Кайо, устроив по этому поводу лишь небольшую вечеринку для самых близких друзей...



Банкир Руй Новаэс, после разоблачений Терезы и Олавиню, попал в тюрьму и, несмотря на все усилия адвоката, продолжал отбывать свой срок. Олавиню, победив на выборах, стал конгрессменом и собирался жениться на Пауле, но она все еще находилась во власти своей маниакальной идеи, претерпевшей, правда, некоторые изменения. Теперь она уже не надеялась получить в мужья Родригу, а лишь страстно жаждала отомстить Ниси.

— Она не должна родить! — как заклинание твердила Паула, и лихорадочный блеск в ее глазах пугал Олавинью. Она до мельчайших деталей продумала план мести и решила осуществить его во время свадьбы Луки и Лижии.

Во время свадебного торжества Рикарду объявил о своей помолвке с Вивианой. А Горети рассказывала про успехи Симони в учебе и про ее романтические отношения с Бруну... Улучив момент, когда Ниси вышла в сад, ее схватили двое громил, нанятых Паулой. Когда Родригу бросился ее искать, машина Паулы уже мчалась на окраину города. С помощью внезапно появившегося Оловинью, Родригу, Тадеу и Лука нашли на окраине Сан-Паулу полуразвалившейся дом, из подвала которого вдруг донесся пронзительный женский крик...

Картина, открывшаяся их взору, была ужасной. Ниси стояла, прижавшись спиной к стенке и закрывая руками живот, а Паула угрожала ей пистолетом и приговаривала: "Ты не родишь! Я прикончу тебя!" Ниси, увидев мужа, потеряла сознание. А Паула, не поняв что произошло, автоматически нажала на спусковой крючок. Прогремел выстрел. К счастью, пуля Ниси не задела. Паулу тут же обезоружил Родригу, а ее подручных схватили Лука и Тадеу... Той же ночью Ниси родила недоношенного ребенка, но мальчик оказался достаточно крепким, и его жизни ничего не угрожало. Ниси, хоть и была очень слабой, выглядела тем не менее радостной и счастливой. Спустя неделю Родригу привез жену и сына домой. А Пауле пришлось провести в психбольнице несколько месяцев.

Эпилог

Когда малыш окреп настолько, что его можно было взять с собой в дорогу, Родригу и Ниси решили, наконец, отправиться в свадебное путешествие. Разумеется, вместе с сыном.

В аэропорту их провожали Рикарду и Вавиана. Все были веселы, шутили и смеялись. Маленький Жау, вероятно, чувствовал общую атмосферу счастья и тоже пытался улыбаться, задорно агукая.

Но вот взрослые разом умолкли, и словно тяжелая черная тень нависла над ярко освещенным залом: это в здание аэропорта вошли Оловинью и Паула. Он за это время приобрел внешнюю солидность и респектабельность, а Паула, наоборот, казалось потускневшей и подурневшей.

—Я не хочу лететь вместе с ними! — испуганно произнесла Ниси. — Лучше сразу сдать билеты.

— Полагаю, вам не придется лететь вместе, — сказал Рикарду. — Эта парочка наверняка направляется в Бразилиа, где сейчас живет Оловинью. Он все-таки женился на Пауле, когда ее выпустили из психушки. Говорят, она теперь стала тихой и смирной.

— Не могу о ней слышать! — раздраженно бросила Ниси. — Давайте вернемся домой. Эта встреча — дурной знак.

— Перестань, не надо так расстраиваться, — принялся успокаивать ее Родригу. — Почему мы вообще должны обращать на них внимание? Не слишком ли много чести?

В это время как раз объявили вылет рейса Сан-Паулу — Бразилиа. Олавинью и его спутница поспешили на посадку.

Ниси облегченно вздохнула: — К счастью, у нас разные рейсы.

— И вообще разные дороги! — подбадривающе улыбнулся ей Родригу.

Подготовил Олег ТОЧЕНЫЙ

РУБРИКА

ТО ЛИ ЕЩЕ БУДЕТ

Самый известный и популярный способ раскладки карт

Задумайте лицо, на которое гадаете. Перетасуйте, подснимите колоду. По одной доставайте из нее карты, приговаривая: для себя, для серд- ца, для дома, что было, что будет, на чем сердце успокоится. Каждая карта ответит на вопрос, под который ее из колоды доставали.

Похожим способом можно гадать на события дня. В этом случае приговаривают: сейчас, через час, к вечерочку, на всю ночку.

Если времени и желания гадать побольше, раскладка усложняется. Выложив первые пять карт перед собой, подснимите колоду еще раз. Следующие карты кладите на первые в том же порядке: шестую на первую, седьмую на вторую и т.д. Перед одиннадцатой картой опять подснимите колоду и положите ее отдельно — этой "сердце успокоится". Снова подснимите и последние пять карт разложите третьими в получившиеся у вас кучки.

А теперь гадайте, ведь простейшие значения карт вам уже известны.


Простейшее значение карт

Те, кто знаком с литературой по теории карточных гаданий, хорошо знают, что не существует единого, общего для всех толкования их значений. Объяснить это легко: для кого-то счастливое число — пять, для кого-то — десять, кому-то черная кошка приносит счастье, кто-то обходит ее за три квартала. Поэтому у матерых гадалок, как правило, складывается своя система значений карт, и держат они ее чаще в секрете.

Значение карты зависит от ее достоинства (дама, король, семерка...), масти (пики, они же вини, бубны, черви, кресты, они же трефы), от соседних карт, от того, вниз или вверх ногами она выпала, в начале или в конце раскладки.

Простейшее значение карт запомнить несложно.

Шестерки — дорога и все с ней связанное: встречи, разлуки, дорога ранняя, поздняя, ближняя, дальняя...



Семерки — свидания: деловые, случайные, любовные...

Восьмерки — известия: приятные, неприятные, нежданные...

Девятки — любовь: счастливая, безнадежная, страстная...

Десятки — разговоры: сплетни, новости, выяснение отношений...

Валеты — юноши или хлопоты: пустые, неверные, неприятные, домашние...

Дамы — женщины: мать, дочь, возлюбленная, злодейка...

Короли — мужчины: начальник, благодетель, завистник, возлюбленный...

Тузы — состояния и дома: деньги, прибыль, убытки..., дом казенный, чужой, родной...

Толкование мастей

1. Червонная масть означает верность, дружбу, любовь, честь, правду и добродетель.
2. Бубновая масть показывает богатство, благополучие, довольно беспечную и веселую жизнь.
3. Пиковая масть вообще значит неприятные происшествия, скуку, потерю, повреждение чести и здоровья, труды, неверность, болезнь.
4. Трефовая масть означает надежду на счастье в предпринятом намерении, также успех у женского пола, разумеется, если только мужчина состоятельный.

А ЯШЧЭ БЫЎ ТАКІ ВЫПАДАК...

КАПУСНАЯ ГІСТОРЫЯ

Пад вечар у суботу картэж з шасці легкавушак імчаў па Мінскім тракце ў бок Ісы. На календары значыўся Дзень рыбака, і даўнія сябрукі вырашылі "праветрыцца на прыродзе". Кампанія была невялікая, але вельмі знакамітая: пісьменнік з Мінска, дырэктар вядомага ў горадзе прадпрыемства, два старшыні калгаса, рэдактар мясцовай газеты і нават сакратар гаркама партыі Альфрэд Раеўскі.

На палянцы, у невялікай утульнай хатцы, ужо быў накрыты дашчаны стол. Як толькі кампанія выйшла з машын, пачулася каманда вядомага сярод начальства майстра рыбнай юшкі і шашлыкоў Максіма Цабэркі:

— Дарагія госці! Усіх прашу за стол.

На стале былі і палядвіца, нарэзаная буйнымі кавалкамі, і смажаны ў смятане карп, злоўлены напярэдадні ў Альбярцінскім возеры, і, вядома, юшка з яршоў. Максім хуценька наліў усім па чарцы настоенай на зуброўцы хлебнай самагонкі.

Усе напружана чакалі тост сакратара гаркама Андрэя Раеўскага. Ён, не спяшаючыся, узяў у руку гранёную стограмоўку і пачаў казаць:

— Я вельмі рады, што на нашай зямлі ёсць такія цудоўныя куточкі, дзе вось так, як сёння, можна адпачыць ад гарадскога шуму і спякоты. Вельмі задаволены, што вы, паважаючы мужчынскую дружбу, сабраліся тут на Дзень рыбака, каб абмяняцца думкамі.

Усе дружна перакулілі ў рот чаркі і, сеўшы, сталі частавацца прыгатаванымі прысмакамі.

Праз хвіліну Максім Цабэрак раптам нагадаў усім:

— Паспрабуйце, калі ласка, квашаную капусту, якую захапіў з сабой наш паважаны Альфрэд Міхайлавіч!

Усе дружна пачалі тыркаць відэльцамі ў талерку з прапанаванай капустай.

— Цудоўная! — першым азваўся рэдактар газеты Антон Кісляк. — Сапраўдная майстрыха ваша жонка, Альфрэд Міхайлавіч, — пахваліў ён.




Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Пасля гэтага пахвальба пасыпалася адна за другой ад іншых членаў кампаніі:

— Ну, і капуста! Ну і смаката! — наперабой адзін другому хвалілі сакратарову капусту госці.

— Трэба будзе абавязкова спытаць у вашай паважанай Клаўдзіі Іванаўны рэцэпт яе прыгатавання, — сказаў Андрэй Кісляк.

Посуд з расхваленай капустай апусцеў у момант. І толькі шафёр сакратара Пятрусь Якімчык ладна ўплятаў за абедзьве шчакі палядвіцу. Яна яму спадабалася значна больш за капусту ягонага начальніка.

Пісьменнік з Мінска Максім Цабэрак паважна зазначыў:

— Пакуль вы курылі і гаманілі, я тым часам даведаўся ад Альфрэда Міхайлавіча, што капусту квасіла не яго жонка, а ён сам. Так што рэцэпт пытайце ў яго самога. У хатцы ўзнік дружны гоман.

Пачакаўшы, пакуль усе сціхнуць, Альфрэд Раеўскі сціпла сказаў:

— Ты, Максім, надта не хвалі мае здольнасці. Нічога асаблівага — капуста, як капуста.

Але пасля гэтых слоў госці загулі, нібы пчолы ў вуллі. Кожнаму хацелася як мага лепш пахваліць здольнасці сакратара гаркама.

— Прапаную тост за нашага паважанага Альфрэда Міхайлавіча Раеўскага, — выгукнуў старшыня калгаса Аркадзь Пастронак. — Шчасця Вам, доўгіх гадоў жыцця! І каб вы яшчэ шмат гадоў частавалі нас такой смачнай капустай, — пад гучныя воклічы закончыў Пастронак.

Гулянка зацягнулася за поўнач. На небе свяціў месяц, але дахаты ніхто не спяшаўся. Рэдактар газеты, выбраўшы зручны момант, з блакнотам і ручкай падышоў да сакратара гаркама:

— Будзьце ласкавы, Альфрэд Міхайлавіч, скажыце ваш рэцэпт прыгатавання капусты?

Раеўскі дакурыў дарагую цыгарэту і пачаў тлумачыць Андрэю Кісляку, як ён гатаваў капусту. Кісляк ледзь паспяваў запісваць. Астатнія таксама рабілі выгляд, што іх гэта вельмі цікавіць. Скончыўшы, рэдактар схаваў блакнот у кішэню і прапанаваў:

— Давайце вып'ем за выдатны рэцэпт Альфрэда Міхайлавіча!

Пасля "аглаблёвай" уся кампанія вываліла з хаткі і пачала ўладкоўвацца ў сваіх легкавушках.

У хатцы засталіся трое: яе гаспадар Максім Цабэрак, рэдактар газеты і шафёр сакратара гаркама. Трэба ж было некаму сабраць са стала, бо Цабэрак ніколі не пакідаў тут беспарадку. Раптам Цабэрак убачыў на століку ў кутку 2-літровы слоік з квашанай капустай.

— Хтосьці прывёз, і не змаглі нават пакаштаваць, — з жалем сказаў ён.

— Дык гэта ж капуста Альфрэда Міхайлавіча, — паведаміў вадзіцель сакратара Якімчык. — А на стол я паставіў слоік са сваёй капустай. І мне будзе вельмі прыемна паведаміць жонцы, што яна добра яе заквасіла, — сказаў ён.

Ад такой нечаканай навіны ў Андрэя Кісляка ажно губа адвісла...

Валянцін ЧУРЫЛА

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

УВАГА! КОНКУРС

"ШТО Б ГЭТА ЗНАЧЫЛА?"

ад "Kodak-Люкс"

Паважаныя чытачы!

Сёння мы друкуем вашы подпісы да здымка, які быў апублікаваны ў шостым нумары "ГС". Конкурс працягваецца. Чакаем ад вас новых подпісаў і здымкаў. Пераможцы будуць узнагароджаны 1 красавіка.



***

Одели рубаху, одели штаны,
И в кресло заставили сесть.
Поверьте мне, братцы,
моей нет вины,
Мне лучше бы дали поесть.
Елена Соколова

***

Хоть мгновенье, но в натуре,
Я в людской побуду шкуре.

***

Хоть в человеческой одежде,
Собачью думу думаю:
Хотел бы быть таким,
как прежде,
А не сидеть, как мумия.
Наталья Эгерд

***

Родила царица в ночь
Не то сына, не то дочь,
Не мышонка, не лягушку,
А неведому зверушку.
Алеся Мандрик

***

Раньше был
бродячим "пёсом",
А теперь — собачьим
боссом.
Елена Яковчук

***

Вам привет с большой
тусовки!
Я один. Подруга дней
Покупает мне кроссовки
И ушанку помодней.
Лариса Козлова

***

Красивые брючки
У песика Жучки,
Приходите в гости к нам —
Пофорсить их вам я дам.
Надежда Добриян

***

Приходите свататься —
Я не стану прятаться.

***

В моей будке нету кресла,
Вот махнул с хозяйкой местом.
Виктор Новоселов

***

Я не модель, не модельер,
Я — элегантный кавалер.
Денис Присняк

***

Так Трезора нарядили,
Только вот обуть забыли!

***

Я не "новый", не "крутой",
А печальный, холостой.
Ирина Беглик

***

Не смотрите на меня,
Что я чернокожий.
Я на папу не похож —
Мне сосед дороже.
Екатерина Дорофейчик

***

Чтобы внешность изменить,
И среди дворняжек
выделяться,
За модой должен я следить
И красиво одеваться.
Юрий Яговдик

***

Шел мимо "Красного креста"
И вдруг увидел я в окне —
Штаны давали всем, и мне
Досталась парочка одна,
И в них сижу я у окна.
Сергей Ламеко

***

Ну, ты песик, не сердись,
Сел сниматься — улыбнись!
Евгений Скробутан

***

Мне б еще на плечи шаль,
Может взяли б в "Этуаль".
Светлана Болтик

***

Одел штаны, съел чебурек,
Ну, чем я вам не человек.
Наталия Бошко

***

Вырас нейкі абібок,
Ён ад дому — ні на крок!
Усяго, што мог рабіць —
На канапе лынды біць.

***

А я пока хожу в детсад.
Рисую там, пою...
Мне мама с папой говорят —
Надежды подаю.
Елена Случко

***

Вось такі ў нас ёсць сабака,
Клічам мы яго Макака,
Размаўляць ён не ўмее,
Але ўсіх нас разумее.
Таццяна Кучун

***

Маю з Толікам адзін памер,
Пагля дзіце, чым не
модны кавалер?!
Ірына Абуховіч

***

Человек собаке друг —
Это знают все вокруг.
Татьяна Тарасик

***

Говорили, что не модный —
Я на танцы не ходил.
А теперь получку дали —
Телевизор я купил.
Инна Мойсейчик

***

Вось надзелі мне штаны,
У крэсла пасадзілі.
Буду я гаспадаром —
Так пастанавілі.
Наталля Рашэтнікава

***

Был Татошей, стал Антошей.
Никита Барановский

***

Надел новые брючки,
Пошел в гости к Жучке.
Хоть я Полкан, а не султан,
Усадила на диван.
Анна Глечикова

***

У меня сестренки нет,
У меня братишки нет...

***

Одинокий ягд-терьер по кличке Джек желает познакомиться...

***

А я сяду-прысяду
На хвілінку-другую,
А назаўтра ў буду
Зноў драмаць я пайду.
Лілія Пруднікава

***

Кофту взял я у Наташи,
А штаны стянул у Саши.
На диван вскочил скорей,
А теперь снимай, Сергей!
Дмитрий Матяско

***

Пусть зовут, как и прежде,
Бобиком,
Я не слышу —
фильм любимый идет.
А хозяин? Он там, на коврике
Кость грызет и меня стережет.
Светлана Козлова

***

Не могу жить по-собачьи —
Одеваюсь у "Версачи".
Дмитрий Миронов



Фото Рената БАКИЕВА

Што б гэта значыла? (№8)

ГОРОСКОП

С 18 ПО 24 ФЕВРАЛЯ



ОВЕН

С 21 февраля и до конца периода вы будете чрезвычайно довольны и счастливы. Благоприятные перемены в семье, добросердечие друзей, очень выгодная сделка - все это для вас.



ТЕЛЕЦ

21-22 февраля возможна встреча, которой вы давно добивались, с человеком, который вам был чем-то обязан и долго не показывался на глаза. Небольшие деньги, короткая командировка.



БЛИЗНЕЦЫ

На работе - препятствия и срыв планов. Не совсем приятные новости от родственников или близких людей: возможно о болезни или потере. В чувствах - полный застой.



РАК

Жизнь, как стеклышки в калейдоскопе - то плохо, то отлично. Настроение меняется через пять минут. Много новых впечатлений и знакомств. Вы обнаружите, что весьма популярны у противоположного пола.



ЛЕВ

Вы таинственны и непредсказуемы. Создадите массу проблем другим людям, сами при этом оставаясь в тени. Возможен сюрприз в личной жизни, сами того не ведая, станете объектом воздыханий.



ДЕВА

Потери и разочарования. Очень много работы и проблем личного характера. Вы должны взять себя в руки, и решиться на перемены, которые вам давно "подсовывает" судьба. Не будьте столь консервативны. Вы утомлены эмоционально и физически, стоит побольше отдыхать в одиночестве. Обратите внимание на домашних, они страдают без вашего внимания. На работе возможно интересное задание или начало нового проекта.



ВЕСЫ



СКОРПИОН

Желание полениться и уклониться от работы может рассорить с коллегами. Неожиданный поворот событий. Могут быть денежные потери или кража имущества. Не выезжайте в дорогу, особенно в выходные дни.



СТРЕЛЕЦ

Вы рискуете стать мошенником по неволе и случайно присвоить чужую славу или дивиденды. Период интенсивной перестройки себя и равнодушия к близким людям, что чревато непониманием и ссорами.



КОЗЕРОГ

Хотите вы того или нет, но придется отправиться в командировку, а дела тем временем могут здорово пострадать, так что не пожалейте времени и дайте всем четкие и ясные указания.



ВОДОЛЕЙ

Самый лучший день для принятия важных решения и заключения долгосрочных сделок - 19 февраля. Воспользуйтесь этим днем, ничего не откладывая «на потом». Временные финансовые трудности.



РЫБЫ

22 будьте предельно осторожны во всем, остальные дни более благоприятны и удачны для отдыха и развлечений, чем для работы и планирования. Эмоциональная неустойчивость, агрессивность, повышенная требовательность к другим.

За мінулы тыдзень у Слонімскім аддзеле ЗАГСа зарэгістраваны дзеткі, якія нядаўна нарадзіліся:

Бялевіч Ілля
Лукашэвіч Арцём
Зенаў Данііл
Зубко Максім
Салдатаў Адзерцьян
Крыўда Аляксандра
Панасеня Аляксей
Зязюлін Мікіта
Цітко Таццяна
Біліда Дзмітрый
Мельнік Анастасія

За мінулы тыдзень у Слонімскім аддзеле ЗАГСа зарэгістраваны шлюбы:

Аксана Анісімюк і Андрэй Пракаповіч

Марына Блажыевіч і Сяргей Кавалеўскі

СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ

Лузін Анатоль Паўлавіч,	1938 г.н.
Белавус Канстанцін Гаўрылавіч,	1908 г.н.
Халадок Марфа Фомаўна,	1915 г.н.
Пятроўская Юзэфа Казіміраўна,	1932 г.н.
Стурліс Станіслаў Уладзіміравіч,	1945 г.н.
Пракапчук Мікалай Юр'евіч,	1942 г.н.
Алейнікава Лілія Іванаўна,	1952 г.н.
Лазюк Уладзімір Сцяпанавіч,	1927 г.н.
Семко Іван Мікалаевіч,	1915 г.н.
Бакавец Мікалай Сцяпанавіч,	1924 г.н.

Выражаю сердечную благодарность всем, кто помог в организации похорон, а также почтил память моей мамы своим присутствием. Искренне признательна вам, добрые люди.

Елена Сергеенко

Магазин «АВТОЗАПЧАСТИ» Широкий выбор автозапчастей и масел на российские автомобили.

ПОСТУПИЛИ в продажу: крылья передние, задние, пороги, облицовки радиатора, арки, полики, панжироны и др. кузовные запчасти к а/м ВАЗ-2101—2107, "Нива".

ПРИНИМАЕМ заявки на кузовные запчасти ВАЗ-2108, 2109, "Москвич-2140", "Москвич-412", "Волга".

понедельник — пятница с 9.00 до 18.00
суббота, воскресенье с 9.00 до 15.00 без обеда

Форма оплаты любая. ул. Красноармейская,73

АНЕКДОТЫ

☺ -Папа, почему ты женился на маме ?
-Вот видишь,- обращается отец к жене,- даже ребенок этого не понимает!

☺ Встречаются два грузина:
-О, Гиви, если бы ты видел мою новую машину !
-А какого она цвета ?
-Ну, представь себе солнце на закате. Вот такая же, только зеленая!

☺ Приходит муж домой. Жена в слезах, рыдает:
-Что случилось?
-Кошка съела мои пирожки.
-Не волнуйся дорагая, я куплю тебе новую кошку.

☺ -Что это за татуировка у тебя ниже спины: 00-88 AIA?
-Это не татуировка, это жена нажала на газ, когда я гараж открывал.

☺ - Дети, кто самый известный человек в мире? Кто ответит правильно получит в награду шариковую авторучку. С последней парты поднимается Вовочка и говорит:
- Самый известный человек в мире Ленин.
- Правильно, Вовочка. Ручка твоя. Вовочка возвращается за свою парту и бормочет себе под нос:
- Извини, Винету. Бизнес есть бизнес.

КРОССВОРД

от Владимира Вашуты

ПО ГОРИЗОНТАЛИ:
4. Пресноводная рыба. 5. Известный советский педагог и писатель. 7. Великий русский писатель. 14. Озеро в Венгрии. 15. Сооружение в порту. 16. Старинное военное укрепление. 19. Начальный момент спортивного состязания. 20. Самопишущий прибор для точного измерения коротких интервалов времени. 21. Молоко после удаления из него жиров сепаратором. 22. Поэтический жанр. 23. Длинная плеть, кнут из мелко свитых ремней или веревок. 24. Противоположное значение прогресса. 27. Учитель, наставник. 28. Предметы театральной обстановки. 30. Особа, личность.

ПО ВЕРТИКАЛИ:
1. Столица государства в Африке. 2. Персонаж романа Ж.Верна "Таинственный остров". 3. Верхняя часть фасада здания. 6. Незасыхающая пластичная масса из глины, воска и жиров для лепки различных фигур. 8. Плодовый кустарник. 9. Телескоп для фотографирования Солнца. 10. Большой круглый хлеб. 11. Древнегреческое название Западной Грузии. 12. Злободневное острое, обычно небольшое сочинение обличительного, политического характера. 13. Музыкант оркестра. 17. Старинная мера пахотной земли. 18. Настенный светильник. 25. Немецкий физик, лауреат Нобелевской премии. 26. Высокий женский голос. 29. Внешняя передняя часть здания.

ОТВЕТЫ НА КРОССВОРД (№7)

ПО ВЕРТИКАЛИ: 1. Осака. 2. Пастернак. 3. Колба. 4. Атрато. 6. Африка. 9. Урал. 11. Кета. 14. Козерог. 15. Пиранья. 17. Арина. 18. "Рюрик". 20. Клоун. 21. Скала. 24. Венесуэла. 26. Трек. 29. Бриз. 30. Шкафут. 31. Аркада. 34. Слега. 35. Анапа.

ПО ГОРИЗОНТАЛИ: 5. Стадо. 7. Утка. 8. Лифт. 10. Арена. 12. Арбитр. 13. Скутер. 16. Талер. 19. Дотация. 20. Класс. 22. Тимирязев. 23. Патронташ. 25. Каток. 27. Полесье. 28. Набат. 32. Феникс. 33. Тротил. 34. Сосна. 36. Буре. 37. Анды. 38. Галоп.

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016


УВАГА, КОНКУРС!

ШАШКІ

З сённяшняга нумара мы пачынаем змяшчаць заданні конкурсу рашэнняў пазіцый, пераможцы якога будуць узнагароджаны шашачнай літаратурай з аўтографамі вядучых шашыстаў Беларусі.

Прапануем вашай увазе першыя чатыры заданні:

1. Белыя: d3, d2, e3, e5, g1, h6 (6). Чорныя: b4, c5, c7, f2, f8, g7 (6).
2. Белыя: a1, a5, b2, b4, c3, f2 (6). Чорныя: b8, c7, d4, d8, e5, g7 (6).
3. Белыя: a3, b4, c5, d4, f2, f4, g1, h2 (8). Чорныя: a7, b8, d6, e7, f6, g7, h4, h6 (8).
4. Белыя: a1, c1, g1 (3). Чорныя: e3, h2 (2).



Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Свае рашэнні дасылайце на працягу двух тыдняў са дня апублікавання на адрас: 231800, Слонім, вул. Я. Купалы, 5, рэдакцыя "Газеты Слонімскай" (з паметкай "Шашкі").

Рашэнне трэніровачных пазіцый, апублікаваных у "ГС" 21 студзеня 1999 года:

Заданне 1.
1. b4-c5 d6:b4 2. h2-g3 f4:h2 3. d2:b8 h6:f4 4. b8:g3 h2:f4 5. b2-c3 b4:d2 6. c1:g5 X

Заданне 2.
1. f2-g3 h4:d4 2. e1-f2 g5:e3 3. b2-c3 d4:b2 4. f2:a1 X

Заданне 3.
1. e5-d6 e7:c5 2. d4:b6 a5:c7 3. c3-b4 a3:c5 4. e3-d4 c5:e3 5. d2:f8 з выйгрышнай пазіцыяй.

Заданне 4.
1. c7-b4 f4-e3 (калі 1... f4-g3, то 2. b8-a7 g3-f2 3. g1:e3 h2-g1 4. e3-d4 X) 2. g1-f2! e3:g1 3. b8-a7 і 4. a7:g1, запіраючы шашку чорных.

Правільныя рашэнні даслалі: Дзегіль В. М., Казялецкі Аляксандр, Кудзелька Сяргей, Кулеш Аляксандр, Леашкевіч Юлія, Майсейчык Іна, Плакушчы Дзяніс, Сакалоўскі Яўген, Сашко Павел, Тарасенка Віктар, Чэкан Сяргей, Шыкуць Павел, Ярашэвіч Дзяніс (усе са Слоніма), Вянскоўская Юлія, Журовіч Аляксей, Журовіч Юрый, Крыцкі Аляксей, Малінка Марына (Рахавіцкая СШ).

Кандыдат у майстры спорту Аляксандр АНІСЬКА


ШАХМАТЫ

Працягваецца шахматны конкурс рашэння задач і эцюдаў.

На яго першае заданне правільныя адказы раней за іншых даслалі слонімцы Л.Барташ і А.Букач, жыхар г.Баранавічы В.Гаўрук. Камбінацыя Х.Барталовіча вырашаецца першым ходам — Лd5.

Сёння мы прапануем другое заданне (глядзі малюнак). Як закончыцца гэтая партыя? Ход белых. Адказы дасылайце па адрасе: 231800, Слонім, вул.Я.Купалы, 5, "Газета Слонімская" (з паметкай "Шахматы"). Просьба ў адказах на заданні-задачы ўказваць першы ход, у эцюдах — варыянт.

Станіслаў АЛЬХОВІК



Расклад руху аўтобусаў № 8, 10	ПРАЦОЎНЫЯ ДНІ

(дзейнічае з 22 лютага)

МАРШРУТ № 8

пл. Леніна 6.35, 7.35, 8.35, 9.35, 11.15, 12.15, 13.15, 14.15, 15.15, 16.15, 17.15, 18.15, 19.15, 21.00, 22.00, 22.55, 0.10.

Зорная 6.03, 7.03, 8.03, 9.03, 10.03, 11.43, 12.43, 13.43, 14.43, 15.43, 16.43, 17.43, 18.43, 19.43, 21.25, 22.25, 23.25, 0.35.

МАРШРУТ № 10

пл. Леніна 6.55, 7.25, 7.55, 8.25, 8.55, 9.25, 10.25, 10.45, 11.45, 12.15, 12.45, 13.15, 13.45, 14.15, 14.45, 16.00, 17.00, 18.10, 19.00, 20.30, 21.30, 22.30, 23.30.

Санаторна-лясная школа 6.25, 6.55, 7.25, 7.55, 8.25, 8.55, 9.25, 9.55, 10.55, 11.15, 12.15, 12.45, 13.15, 13.45, 14.15, 14.45, 15.15, 16.30, 17.30, 18.33, 19.30, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00.

СОВЕТЫ БЫВАЛЫХ

КАК ОТЛИЧИТЬ ФИРМЕННУЮ ВЕЩЬ ОТ ПОДДЕЛКИ

Колготки — вещь тонкая. Они могут порваться при неосторожном обращении в первый же день носки. Но если быть аккуратной, колготки прослужат долго, однако, лишь в том случае, когда они фирменные, а не фальсифицированные. Как же отличить подделку от оригинала?



Прежде всего, обращайте внимание на цену. Например, фирменные колготки плотностью 40 den не могут стоить дешевле двух долларов.

Обратите внимание на упаковку — целлофановый пакет. У поддельных колгот целлофан тонкий, плохо склеен. При распаковке он может тут же порваться, фирменный пакет прослужит долго.

Как правило, на упаковке фирменных колгот в правом верхнем углу пропечатан размер. Это же сделано и на бумажном ярлыке, которым склеивается пакет. Там же стоит и штрих-код страны-изготовителя. Второй штрих-код обозначен на фирменном пакете внизу с оборотной стороны.

Фирменные колготы, как правило, снабжены картонным вкладышем, на котором стоят обозначения изготовителя и другая информация о товаре. Поддельные вкладыши, чаще всего, изготовлены из серого, невзрачного картона.

Самое главное — колготки важно осмотреть в развернутом виде. Если они слишком тонкие или на полотне встречаются горизонтальные затяжки — это явно не "фирма".

Продавцы фирменных колгот — на рынке или в магазине — должны иметь сертификат качества на товар. У тех, кто продает подделку, этого документа нет и в помине.

Кстати, чаще всего подделывают колготки таких фирм, как "Санпелегрино", "Омса", "Леванте" и "Голден Леди".

По материалам печати подготовил Тимур ЮРДЕНОВ

ГУМАРЭСКА

АНЁЛАК НА КАПЫТЦАХ

Міхася Калтуна кінула трэцяя жонка. Пасля судовага разводу ён прыехаў дадому і моцна стукнуў кулаком па стале. Ад грукату жывой кавадлы спалохана затрэсліся фіранкі на вокнах і ляснулі ўстаўныя сківіцы яго жвавай матулі.

— Усё! Больш жаніцца не буду! — падвёў вынік свайму сямейнаму шчасцю Міхась. — Няма дурных!

— Будзеш, — уладкаваўшы на месца сківіцу, пазмяінаму ласкава праспявала мамачка і пачала загінаць і без таго сагнутыя, нібы ногі вялікага павука, пальцы.

— Карова, двое свіней, куры, качкі, індыкі. І ўвесь гэты статак ты хочаш пакінуць на мяне адну? Сам з раніцы да вечара на трактары трасешся, а я кармі і даглядай гэта пекла? Дудкі!

— Прададзім, мамка-а, — малочным цяляткам прамычаў сын і нізка сагнуў сваю бычую шыю.

— Я табе прадам! Не гаспадарку трэба збываць, а жонку новую набываць, дзіравая твая галава!

— Хто за мяне пойдзе? Ганна ўцякла з заезджым малайцом, Верка з Караганды не вярнулася. Як паехала да цёткі ў госці, так і знікла. Толькі заяву на развод прыслала. Цяпер Валя гэтак на судзе згнябіла. Кажа, што я не мужчына, а каровін хвост, і нібы я ў цябе пад падэшвай сяджу.

— Усе яны дурніцы! — канстатавала мамачка. — Усе былі з суседніх вёсак і ведалі цябе ўздоўж і ўпоперак. А цяпер мы возьмем жонку "імпартную", здалёк.

Мамачка, спрытам і ўсім абліччам нагадваючая яшчарку, шмыгнула ў другі пакой і хутка вярнулася з газетай.

— Во, пачытай, колькі дзевак замуж просяцца.

— Гэта такія дзеўкі, як я генерал.

— Маўчы, слухай мацеру, калі свайго розуму не маеш. О, піша адна дзеўка, што і вучоная, і прыгожая. Вага невялікая, значыць есць мала. Другая: прыгожая, любіць вязаць, шыць, займаецца спортам. Ды іх тут мноства, як гусеніц у капусце. Выбірай любую. Ўсе прыгожыя, усе ўдалыя. Сватайся, няцямля, пішы пісьмы, а там паглядзім, якую выбраць.

Міхась напісаў. І адказы атрымаў. Аднойчы вечарам яны з мамачкай сабраліся на нараду і вырашылі браць у жонкі тую, якая любіць шыць, вязаць і займацца спортам.

Прайшоў час, і Міхась прывёз у свае Лапушаны новую пацерачку. Пакуль вылазілі з таксі ды расплачваліся за праезд, да Калтуноў збеглася ледзь не ўся вёска. І тут было на што паглядзець! Анёлак, а не кабета! Валасы белыя і кучаравыя, як на памытым маладзенькім баранчыку. Сама мажная, нібы там, адкуль прыехала, адны булкі ядуць. Маленькая худая Міхасёва мамачка побач з ёй здавалася абгарэлай запалкай.

З таксі травяным конікам выскачыў жвавы хлопчык у зялёных штаніках і, усчарэпкаўшыся на сліву, запусціў у старую Калтуніху маленькім, з курынае яйка, каменьчыкам.

З таго дня на сядзібе Калтуноў стала ціха, як у капліцы, што стаіць на старых вясковых могілках. Для Лапушан гэта было вялікай навінай, бо на ранейшых нявестак мамачка крычала з ранку да вечара, не выбіраючы слоў.

Вясковыя кабеты млелі без інфармацыі. Яны бачылі толькі Міхася, які ішоў на работу ці з работы. Ён і кароў на пашу выганяў, і па гаспадарцы ўпраўляўся. Мамачка з нявесткай і хлопчык у зялёных штаніках зніклі ў невядомым кірунку. І ў той час, як у вясковых маладзіц гатова была пачацца эпідэмія інфаркту ад невядомасці, на божы свет выпаўзла Міхасёва мамачка і села на зэдлічку пры сцяне з сонечнага боку. Падвязаўшы кручок жоўтай барады цёмнай хусцінкай, яна нагадвала пакорлівую манашку.

— Дзе ты прападала, Лёдзя? — асмелілася суседка.

— Нідзе, дома была, — надзвычай ласкава адказала Калтуніха.

— Як гэта дома? — няўцяміла тая.

— Хварэла.

— Няўжо? — здзівілася кабета, бо ніхто ў вёсцы век не чуў, каб Калтуніха хварэла.

— А што ў цябе было? — спагадліва падцяла вусны.

— Ну, гэты, як яго... трэс.

— А што гэта? — не зразумела суседка.

— Ды трэснула мяне новая нявестка патэльняй па галаве. І я надта ж спалохалася. Міхась сказаў, што трэс у мяне.

— А за што?

— Ні за што, галубка. Як прывёз яе Міхась надвячоркам, мы пачаставаліся і спаць палеглі. Раніцай я ўжо не ўстаю, думаю, маладая ж гаспадыня ў хаце ёсць. І яна, бачу, не ўстае. Людзі жывёлу ўжо ў поле выганяюць, а наша Лысуха нядоеная стаіць, рыкае. Ну, устала я, прысаромела яе, гэту новую гультайку, на чым свет стаіць, а сама пайшла ў хлеў. Прыходжу, а яна як ляжала, так і ляжыць.

— Уставай, — кажу, — бульбу смаж, калі не хочаш па гаспадарцы ўпраўляцца. Сонца ўжо над вёскай паднялося, а ты ўсё ляжыш, прайдзісветка, гультайка, каб цябе ў чыстым полі пярун спаліў. Зваліліся на маю галаву.

Кажу гэтак, а сама з патэльняй у руках падышла да ложка. Бачу, яна як скрывіцца, нібы воцату глыкнула.

— Чаго ты крывішся? — кажу, — зараз вось як трэсну патэльняй па патыліцы, то не гэтак цябе перакрывіць.

І замахнулася на яе. Не паспела апамятацца, як яна ўсхапілася з ложка, вырвала з рук патэльню, ды па мне лупіць. А гэты яе малы абармот прачнуўся, убачыў бойку, ды як крыкне: "У атаку!", — і давай па мне лупіць усім, што пад рукі трапіць.

Тут Міхась якраз у хату прыйшоў. Разняў нас, сабраў яе лахманы і выкінуў на ганак. А потым змілаваўся, папрасіў у старшыні "казла" і адвёз яе з малым на станцыю. Селі ў поезд і пакацілі ў белы свет,— закончыла сваё апавяданне Калтуніха і памацала галаву.

— А вы ж казалі, што такая прыгожая ды ладная будзе нявестка, як анёлак, — не устрымалася суседка.

— Анёлак, ды не проста так, а на капытцах, фармальны чорт, — сказала мамачка і адвярнулася.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ, Дзятлава


Малюнак Яўгена ІВАНОВА

© PDF: Kamunikat.org 2016 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2016